ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. біржэвіца 10 проц. надатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвод падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 16 сакавіка 1930 г.
№ 63 (3571)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

АБ БАРАЦЬБЕ СА СКРЫЎЛЕНЬНЯМІ ПАРТЫЙНАЙ ЛІНІІ Ў КАЛГАСНЫМ РУХУ

АДОЗВА ЦК УсеКП(б) ДА УСІХ ЦК НАЦРЭСПУБЛІК, УСІХ КРАЁВЫХ, АБЛАСНЫХ, АКРУГОВЫХ І РАЁННЫХ КАМІТЭТАЎ ПАРТЫІ

Атрыманыя ў Цэнтральным Камітэце партыі весткі аб ходзе калгаснага руху паказваюць, што побач з сапраўднымі і сур'ёзнейшымі посьпехамі калектывізацыі наглядаюцца факты скрыўленьня партыйнай лініі ў розныхраёнах СССР. Перш за ўсё, парушаецца прынцып добраахвотнасьці ў калгасным будаўніцтве. У радзе раёнаў добраахвотнасьць замяняецца прымусам да ўступленьня ў калгасы пад пагрозай раскулачваньня, пад пагрозай пазбаўленьня выбарчых правоў і г. д. У выніку, у лік «раскулачаных» трапляе часамі частка сераднякоў і нават беднякоў. Пры чым, у некаторых раёнах процант «раскулачаных» даходзіць да 15, пазбаўленых выбарчых праў — да 15—20. Наглядаюцца факты выключна грубага, агіднага, злачыннага абыходжаньня з насельніцтвам з боку некаторых нізавых работнікаў, якія зьяўляюцца часамі ахвярай правакацыі з боку прымазаўшыхся контр - рэвалюцыйных элемэнтаў (марадзёрства, дзяльба маемасьці, арышт сераднякоў і нават бедняхоў і г. д.).

Пры гэтым у радзе раёнаў падрыхтоўчая работа па калектывізацыі, цярплівае растлумачэньне асноў партыйнай палітыкі як беднаце, так і серадняком, падмяняецца бюракратычным чыноўніцкім дэкрэтаваньнем зьверху разьдзьмутых лічбовых даных і штучным разьдзьмуваньнем процанту калектывізацыі (у некаторых раёнах калектывізацыя ў некалькі дзён «даходзіць» ад 10 да 90%). Такім чынам, парушаецца вядомае паказаньне Леніна аб тым, што калгасы могуць быць жыцьцёвымі і трывалымі толькі ў тым выпадку, калі яны ўзьнікаюць на аснове добраахвотнасьці. Парушаецца пастанова 16 канфэрэнцыі нашай партыі аб недапушчальнасьці ўчынаньня прымусовых мер пры стварэньні калгасаў. Парушаецца статут с.-г. арцелі, зацьверджаны Саўнаркомам і ЦВК СССР, дзе проста сказана, што батракі, беднякі, сераднякі такога-та сяла «добраахвотна аб'ядноўваюць у с.-г. арцель».

Побач з гэтымі скрыўленьнямі наглядаюцца ў некаторых мясцох недапушчальныя і шкодныя для сяла факты прымусовага абагуленьня жыльлёвых пабудоў, дробнае жывёлы, птушкі, нетаварнае малочнае жывёлы, а ў сувязі з гэтым — спробы да галавадзяпскага пераскокваньня з арцельнай формы калгасаў, якая зьяўляецца асноўным зьвяном калгаснага руху — да камуны. Забываюць, што асноўнай праблемай сельскае гаспадаркі зьяўляецца ў нас ня «птушкавая», або «гурковая» праблема, а праблема збожжавая. Забываюць, што асноўным зьвяном калгаснага руху зьяўляецца ў даны момант не камуна, а с.-г. арцель. Забываюць, што іменна таму партыя палічыла патрэбным даць прыкладны статут не с.-г. камуны, а с.-г. арцелі.

У выніку гэтых галавацяпскіх скрыўленьняў мы маем у радзе раёнаў дыскрэдытаваньне калгаснага руху, адліў сялянства з раду наскора-сьпечаных, а таму зусім няўстойлівых камун і арцеляй. Такім чынам, парушаецца ўстаноўка партыі ў тым, што асноўным зьвяном калгаснага руху ў даны момант, зьяўляецца не камуна, а арцель. Парушаецца вядомая пастанова ЦК партыі ад 6-га студзеня 1930 году (гл. «Правду») аб тым, што арцельная форма калгаснага руху зьяўляецца галоўнай яго формай, што нельга, значыць, дапускаць лёгкадумнага пераскокваньня ад арцельнай формы да камуны.

Нарэшце, ЦК лічыць неабходным адзначыць зусім недапушчальнае скрыўленьне партыйнай лініі ў галіне барацьбы з рэлігійнымі забабонамі таксама, як і ў галіне таваразвароту паміж горадам і вёскай. Мы маем на ўвазе адміністрацыйнае закрыцьцё цэркваў бяз згоды пераважнай большасьці сяла, якое вядзе звычайна да ўзмацненьня рэлігійных забабонаў і зьнішчэньне ў радзе месц рынкаў, якое вядзе да пагаршэньня забесьпячэньня гораду. Ня можа быць сумненьня, што такая практыка, якая праводзіцца пад сьцягам «левых» фраз, на самой справе льле ваду на млын контр - рэвалюцыянэраў і ня мае нічога супольнага з палітыкай нашай партыі.

ЦК лічыць, што ўсе гэтыя скрыўленьні зьяўляюцца вынікам простага парушэньня палітыкі партыі, простага парушэньня пастаноў кіруючых органаў нашай партыі, якое можа толькі стварыць глебу для ўзмацненьня правых элемэнтаў у партыі. ЦК лічыць, што ўсе скрыўленьні зьяўляюцца цяпер асноўным тормазам для далейшага росту калгаснага руху і простай дапамогай нашым клясавым ворагам.

ЦК лічыць, што далейшы хуткі рост калгаснага руху, ліквідацыя кулацтва, як класы, немагчымы без безадкладнай ліквідацыі гэтых скрыўленьняў. ЦК абавязвае партыйныя арганізацыі:

1. Спыніць практыку прымусовых мэтадаў калектывізацыі, якая наглядаецца ў радзе месц, вядучы адначасова далейшую ўпартую работу па ўцягненьні сялянства ў калгасы на аснове добраахвотнасьці і ўзмацненьня існуючых калгасаў.

2. Згуртаваць увагу работнікаў на гаспадарчым палепшэньні калгасаў і арганізацыі палявых работ, забясьпечыўшы адпаведнымі гаспадарчымі і партыйна - палітычнымі мерапрыемствамі замацаваньне дасягнутых посьпехаў калектывізацыі і арганізацыйна - гаспадарчае афармленьне с.-г. арцелі.

3. Не дапускаць перавод с.-г. арцеляй на статут с.-г. камун без зацьвярджэньня акркалгассаюзаў і акрвыканкомаў, спыніць прымусовае абагуленьне жыльлёвых пабудоў, дробнае скаціны, птушкі, нетаварнае малочнае жывёлы.

4. Праверыць сьпісы раскулачаных і пазбаўленых выбарчых праў і безадкладна выправіць дапушчаныя ў гэтай галіне памылкі ў адносінах сераднякоў, былых чырвоных партызан, членаў сямей сельскіх настаўнікаў і настаўніц, чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў (радавых і камандных).

5. Сурова кіруючыся правілам аб недапушчэньні ў калгасы кулакоў і іншых асоб, пазбаўлекых выбарчых праў, дапускаць выключэньне з гэтага правіла для членаў тых сямей, у складзе якіх ёсьць адданыя савецкай уладзе чырвоныя партызаны, чырвонармейцы і чырвонафлётцы (радавыя і камандныя), сельскія настаўнікі і настаўніцы, пры ўмове іх паручальнасьці за членаў свае сям'і.

6. Забараніць закрыцьцё рынкаў, аднавіць рынкі, ня ўціскаць продаж сялянамі, у тым ліку і калгасьнікамі сваіх прадуктаў на рынку.

7. Рашуча спыніць практыку закрыцьця цэркваў у адміністрацыйным парадку, фікцыйна прыкрытую грамадзка - добраахвотніцкім жаданьнем насельніцтва. Дапускаць закрыцьце цэркваў толькі ў выпадку сапраўднага жаданьня пераважнае большасьці сялян, [illegible] іначай, [illegible] з зацьвярджэньня пастановы [illegible] абласнымі [illegible] выканкомамі. За выхадкі, якія маюць характар зьдзеку ў адносінах рэлігійных пачуцьцяў сялян і сялянак, прыцягваць вінаватых да самай суровай адказнасьці.

8. Работнікаў, якія ня ўмеюць, або не жадаюць павесьці рашучую барацьбу са скрыўленьнямі партыйнай лініі —зьнімаць з пасад і замяняць іншымі.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б).

Перад пачаткам палявых работ

Пашырыць пасеўную плошчу ня толькі калгасаў, але і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

БЛІЖЭЙШЫМІ ДНЯМІ СКОНЧЫЦЬ ССЫПКУ НАСЕНЬНЯ Ў КАЛГАСАХ

Ажыцьцяўленьню аграмерапрыемстваў і кармоваму пытаньню ўсё яшчэ не аддаецца патрэбная ўвага

Апэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

На 10-га сакавіка

Разьмер калектывізацыі сельскае гаспадаркі па БССР за апошнюю дэкаду ў колькасных адносінах некалькі паменшыўся: колькасьць калгасаў з 3.665 зьнізілася да 3.633 (на 32 адзінкі) з адведным зьмяншэньнем колькасьці пахаці і гаспадарак. Агульны разьмер калектывізацыі на 10 сакавіка складае 65,4 проц. супроць 66 проц. на 1-га сакавіка. Гэты невялікі процант зьніжэньня разьмеру калектывізацыі зьяўляецца зусім натуральным і нармальным і тлумачыцца адсевам тых мёртва - народжаных калгасаў, якія былі арганізаваны толькі на паперы, або былі насаджаны зьверху ў парадку адміністраваньня. Гэты адсеў мёртва - народжаных калгасаў паслужыць толькі на карысьць усёй астатняй масе жыцьцёвых калгасаў і прывядзе да іх замацаваньня.

Колькасьць абагуленых у калгасах кароў за апошнюю дэкаду зьменшылася з 214.100 да 203.610 галоў (з 38.9 проц. да 34,1 проц.). Гэтае зьмяншэньне колькасьці абагуленых кароў тлумачыцца выкананьнем дырэктывы аб пакіданьні ў сялян - калгаснікаў па адной карове ў гаспадарцы ў парадку індывідуальнага карыстаньня для спажывецкіх патрэб.

Рабочая жывёла на 10-га сакавіка абагулена ў колькасьці 177.698 галоў, або 38,7 проц. (супроць 36,6 проц. на 10-га лютага). Такое вельмі нязначнае павялічэньне колькасьці абагуленай рабочай жывёлы павінна прыцягнуць да сябе пільную увагу мясцовых працаўнікоў. Веснавая сяўба набліжаецца і калгасы павінны быць забясьпечаны коннай цягавай сілай у поўным разьмеры.

У абагуленыя фонды калгасаў на 10-га сакавіка ссыпана 115.888 тон збожжавых культур, што забясьпечвае пасеўныя патрэбы калгасаў (арганізаваных на 10-га сакавіка) на 84 проц. Значна горшае становішча ў нас з тэхнічнымі культурамі—на 10-га сакавіка ссыпана 5.621 тона (супроць 5.555 тон на 1-га сакавіка), што забясьпечвае патрэбы калгасаў толькі на 32,3 проц. Такім чынам, мы на сёнешні дзень па лініі калектыўных гаспадарак забясьпечаны насеньнем тэхнічных культур толькі на 1/3 патрэбы. Тут мы маем перад сабой уязьвімае месца, пагражаючы вучастак, і сюды трэба накіраваць усе нашы намаганьні.

Ссыпка насеньня траў за апошнюю дэкаду ўзрасла з 40 проц. да 45 проц.— павялічэньне наяўна нязначнае. Асабліва пагражаючым застаецца становішча з насеньнем лубіну—на 10-га сакавіка ссыпана толькі 20 процантаў.

Збор насеньня збожжавых культур па лініі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі павялічыўся з 49 да 57 проц.

Разьмер вычысткі насеньня павялічыўся з 64 проц. да 73 проц. Збор попелу павялічыўся за дэкаду вельмі нязначна —з 43 проц. да 45 проц.

Зусім дрэнна ідзе размол вапны для вапнаваньня глебы—заданьне пакуль выканана толькі на 23 проц.

Палепшыўся темп абмену гатунковага аўсу на звычайны — з 32 проц. да 46 проц.

Тэлеграма ўпоўнаважанага па пасеўкампаніі ў БССР тав. Рачыцкага

Упоўнаважаным па пасеўкампаніі ў БССР тав. Рачыцкім паслана акругам наступная тэлеграма:

Прыкладна 30 проц. сялянскіх гаспадарак яшчэ будуць засяваць ярыну ў індывідуальным парадку. Пашырэньне пасеўных плошчаў індывідуальных гаспадарак будзе забясьпечана тады, калі побач з мерапрыемствамі па пашырэньні плошчаў ярыны ў калгасах будуць праведзены мерапрыемствы па дапамозе бядняцка-серадняцкім індывідуальным гаспадаркам.

Прапаную ўзмацніць работу ў бядняцка - серадняцкім індывідуальным сэктары, праваяраючы давядзеньне плянаў яравых пасеваў да двара, арганізуючы пасенную дапамогу бядняцкім гаспадаркам па лініі КСУ.

Прымеце меры да растлумачэньня аб тых ільготах, якія даюцца бядняцка - серадняцкім гаспадаркам па лініі с.-г. падатку за пашырэньне пасеўных плошчаў.

Пашырайце ўвядзеньне аграмінімуму, паладзьце ўлік мерапрыемстваў па аграпамічным абслугоўваньні індывідуальнага сэктару.

Дабівайцеся правядзеньня грамадзкага засеву сярод насельніцтва, якое не ўвайшло ў калгасы.

Спыніць пераводы арцеляй на статут камун

НАРКАМЗЕМ СССР ЗАБАРАНІЎ ЗБОР НАСЕНЬНЯ ІНДЫВІДУАЛАЎ У АБАГУЛЕНЫЯ ФОНДЫ.

Наркамзем [illegible] лены у дадатак да распараджэньня аб забароне да сканчэньня пасеўнае кампаніі якіх-бы там ні было перагруповак арцеляй і іх павялічэньня пасланa распараджэньне па месцы — неадкладна спыніць перавод арцеляй на статут камун.

Наркамзем катэгарычна забараніў так сама збор насеньня індывідуалаў у абагуленыя фонды і запрапанаваў наркамкамзем сваіх рэспублік і крёнам і акруговым земельным кіраўніцтвам, якія робяць такія зборы прыцягваць вінаватых да адказнасьці.

Сыгналізуем небясьпеку

Стварыць кармавыя рэзэрвы

ГОМЕЛЬ (Наш кар.). Пагражаючае становішча стварылася ў акрузе з кормам. Амаль зусім няма корму ва ЎВАРАВІЦКІМ, РЭЧЫЦКІМ і ЦЗРАХАЎСКІМ раёнах. Напрыклад. у калгасе імя КАЛІНІНА, РЭЧЫЦКАГА раёну тэрмінова патрабуюцца 300 тон сена і іх недзе ўзяць.

Райкалгассаюзы, ня гледзячы на свае часовае [illegible] ньня паказаньні акркалгассаюзу, палявдсаюзу і малочсаюзу, ня прынялі дастатковых мер, каб [illegible] забясьпечыць калгасы кормам.

У калгасах акругі не хапае да 300.000 пудоў корму.

Вельмі дрэнна стаіць пытаньне з забесьпячэньнем грубым кормам буйных малочных гаспадарак. Малочныя фэрмы засталіся бяз крэдытаў на закупку корму. У акрузе сродкаў для гэтай мэты няма.

Становішча надзвычай цяжкае, раёны задыхаюцца ад адсутнасьці кармавых рэзэрваў, а сродкі калгасаў па закупцы кармоў не мабілізаваны.

Сыгналізуючы небясьпеку, што ў хуткім часе корму ў калгасах і ў малочных гаспадарках ня будзе, трэба адзначыць, што адзіным выхадам зараз зьяўляецца неадкладная мабілізацыя мясцовых сродкаў на закупку кармоў у сельгаспрадпрыемстваў.

Саўгасы акругі забясьпечаны сенам і аўсом. Не хапае канцэнтраванага корму (жмыхі, атрубей і г. д.) для малочнай жывёлы.

25-ЦІТЫСЯЧНІКАЎ ЗАЦІРАЮЦЬ

Абураючыя адносіны да мабілізаваных рабочых у Аршанщчыне

У асобных раёнах Аршанщчыны адносіны да рабочых 25-тысячнікаў трэба прызнаць зусім недапушчальнымі. Мае новыя савецкія і партыйныя арганізацыі не паклапаціліся склаціці адпаведных умоў працы для іх. Нічога ня робіцца ў тым напрамку, каб канкрэтна дапамагчы мабілізаваным у калгасы рабочым выконваць ускладзеныя на іх задачы.

Вось рад прыкладаў. У Новаасельскім сельсавеце Талачынскага раёну 25-тысячнику проста сказалі таксама:

— Ты, таварыш рабочы, набудзь пакуль што каля праўленьня. Пагадзім, як да цябе аднясецца маса.

У Воўкаўскім сельсавеце ў калгасе «Чырвоны Кастрычнік» мабілізаваны рабочы ўсё яшчэ ходзіць у «камісарах» калгасу. Старшыні праўленьня гэтага калгасу ня хочацца пакідаць сваёй пасады і ён імкнецца на кожным кроку ігнараваць і кампрамэтаваць прыехаўшага рабочага.

Вельмі часта бывае (што зусім зразумела), калі рабочы, ня будучы ў курсе справы ўсяго жыцьця калгасу, ня можа вырашыць пэўнага пытаньня.

Мясцовыя-ж партыйныя і савецкія арганізацыі не аказваюць ніякай дапамогі ў гэткіх выпадках. Ня прыходзіць гаварыць аб тым, што з боку мясцовых партыйных арганізацый няма ніякага сыстэматычнага кіраўніцтва працаю 25-тысячнікаў.

Між іншым, трэба адзначыць, што да гэтага часу яшчэ канкрэтна нічога ня зроблена, каб урэгуляваць пытаньне з аплатаю 25-тысячнікаў. У калгасах зусім няма сродкаў, каб выплаціць рабочым тую частку зарплаты, якую яны павінны выплачваць. Прадпрыемствы таксама не выдаюць сваю частку зарплаты. Ніхто ня цікавіцца гэтаю справаю. Між тым, 25-тысячнікі засталіся зусім бяз грошай і сродкаў для існаваньня.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Адстаўка ўраду Бартэля

ВАРШАВА, 15. Урад Бартэля падаў у адстаўку. У палітычных колах ня сумняваюцца, што адстаўка будзе прынята прэзыдэнтам, і чакаюць, што габінэту Бартэля будзе даручана часовае выкананьне абавязкаў да назначэньня новага ўраду. У якасьці праўдападобнага кандыдата на пост прэм'ера называюць лідэра беспартыйнага блёку палкоўніка Слаэзна. Многія мяркуюць, што фармаваньне новага габінэту будзе даручана зноў Бартэлю.

Зараз пілсудчыкі прабуюць прадставіць цяперашні ўрадавы крызіс як вынік злосных інтрыг парламэнцкіх партый. Сапраўды-ж крызіс справаваканы самім урадам. Прапанова ППС аб выказе недавер'я міністру Прымстару мела ўсе шансы на правал, калі-б Бартэль не сказаў пад дыктоўку Бальвэдара ў сэнаце рэзкай прамовы, накіраванай супроць парляментарызму. Палкоўніцкай групе трэба было такое выступленьне Бартэля, каб паказаць, што «парат міролюбівы Бартэль ня можа працаваць у згодзе з соймам». Бартэль, разумеючы, што яго роля пасьля зацьвярджэньня дзяржбюджэту скончана, палічыў за лепшае быць праваленым апазыцыяй, чым свайёй уласнай партыяй.

У палітычных колах паведамляюць, што новы ўрад будзе прытрымлівацца гэтак званага палкоўніцкага курсу.

Антысавецкія малебствы ў Баўгарыі

ВЕНА, 13. Як паведамляюць з Софіі, 9-га сакавіка ў царквох адбыліся антысавецкія малебствы. Малебствы сабрала мала публікі. Прысутнічалі пераважна расійскія беларэвалюцыянэры. Баўгарскі генэрал Лазараў сказаў пазітычную прамову аб гатоўнасьці Баўгарыі «усімі сіламі» садзейнічаць зьвяржэньню бальшавізму.

З пратестам выступіў дэпутат рабочае партыі Калайджаноў. Адтак, узброеныя фашыстыя не далі яму гаварыць і прымусілі яго выйсьці. Контр-дэманстрацыя, якая была абвешчана рабочай партыяй, была набаронена паліцыяй. Па ўсім краі пашырыліся дзікі рабочае партыі. Перад некаторымі царквамі адбыліся контр - сходы рабочых, якія былі разагнаны паліцыяй. Арыштавана звыш 50 чал.

Землеўпарадкаваньне, якое зрывае сяўбу

Да апошняга часу яшчэ ў Чырвона-Спабодзкім раёне Бабруйскае акругі былі такія настроі, што пакольні ён зьяўляецца раёнам суцэльнае калектывізацыі, дык зварачаць увагу на падрыхтоўку да сяўбы ў індывідуальным сэктары ня трэба. Такія погляды былі ўласьцівы многім раённым работнікам, ня гледзячы на тое, што ў радзе вёсак з 200 гаспадарак толькі 50 увайшло ў [illegible]

Замест таго, каб узмацніць растлумачальную працу па [illegible] - серадняцкіх калектывізаваных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак у калгасы і нагадзаць за падрыхтоўкаю тых індывідуальных гаспадарак, якія ўсё-ж зараз [illegible] хочуць увайсьці ў калгасы, мясцовыя работнікі праводзілі такую агітацыю:

— Калі ня пойдзеце ў калгас, дык высепім вас. Прыдзе вясна, калгас заарэ, а вы сейце сабе на печы.

Трэба адкрыта прызнаць, што ва многіх вёсках такая унцер - прышыбеёўская агітацыя паралізавала падрыхтоўчую працу да сяўбы ў індывідуальным сэктары.

У вёсцы Былевічы, напрыклад, у якой 170 гаспадарак засталося па-за калгасам, ніякай падрыхтоўкі да сяўбы ня робіцца.

Адзей з асноўных перашкод у справе падрыхтоўкі індывідуальнага сэктару да сяўбы зьяўляецца яўна няправільнае зямляўпарадкаваньне, якое было праведзена ў радзе месц, дзе большасьць гаспадарак яшчэ не ўвайшла ў калгас. У такіх калгасах абмежаваньне плошчы калгасу рабіцца з уключэньнем індывідуальных гаспадарак. Дзе [illegible] апошнім невядома. Раённыя арганізацыі зараз [illegible] зразумелі ўсю сур'ёзнасьць становішча, якое [illegible] стварылася, але ня ведаюць, як папраўіць спр[illegible]

Неабходна тэрміновае растлумачэньне Наркамзему наконт зямляўпарадкаваньня. Усялякае замаруджаньне ў гэтай справе роўназначна зрыву сяўбы ня толькі ў індывідуальным сэктары, але нават і ў калгасах.

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

Мабілізаваць сродкі

Спагнаньне запазычанасьці праходзіць слаба

Спагнаньне запазычанасьці і паняканьня па сельска - гаспадарчай сыстэме Менскай акругі праходзіць вельмі дрэнна.

Асабліва кепска стаіць справа з пратэрміноўкамі, якія з 160.000 руб. на 1-га кастрычніка ўзрасьлі да 225.000 руб. на 1 лютага. Дрэнна стаіць таксама справа з паняканьнямі. На пачатку першага кварталу павінна было паступіць пакёў на 100.000 руб., а на сёнешні дзень паступіла ўсяго 21 000 руб

Асабліва адстаюць у справе спагнаньня запазычанасьці раёны сусцэльнай калектывізацыі. У той час, як у сярэднім плян мабілізацыі сродкаў да пасеўнай кампаніі па сельска - гаспадарчай крэдытнай сыстэме выкананы на 87 проц., у Барысаўскім раёне мабілізаваны толькі 51 проц., у Капыльскім — 84 проц.

Горш за ўсё стаіць справа са спагнаньнем запазычанасьці ад асоб, якія не займаюцца сельскаю гаспадаркай: кіраўнікоў мясцовых устаноў, аграномаў, настаўнікаў і г. д. У Зэмбінскім крэдытным таварыстве пам. пракурора Ігнаньцеў узяў пазыку ў 100 руб., бухгальтар Самахвалавіцкага крэдытнага т-ва Сабалеўскі 100 руб., агранома Яфстафьеў і Іваноўскі узялі ў Лошыцкім крэдытным таварыстве 300 руб. і г. д. Усе гэтыя асобы не сьпяшаюць пагасіць сваю запазычанасьць, і да гэтага часу ніякіх узносаў не рабілі. Усяго ад такіх служачых на акрузе запазычанасьць дасягнула 13.000 руб.

Мясцовыя арганізацыі і праўленьні калгасаў ніякай увагі не здаляюць пытаньню мабілізацыі сродкаў.

Цікава адзначыць, што Белкалгасцэнтр толькі 7 сакавіка прыняў пастанову, у якой прапануецца акркалгассаюзам прыняць рашучыя меры ў дапамозе крэдытным т-вам спагнаць запазычанасьць і ўзмацніць прыцёк паёў ад калгасьнікаў. Учора яшчэ Белкалгасцэнтр не разаслаў дырэктыў акркалгассаюзам.

Справа „СВУ"

УКРАІНСКІЯ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРЫ ПЕРАД ПРАЛЕТАРСКІМ СУДОМ

ДОПЫТ НІКОЎСКАГА

ХАРКАЎ, 15. 13 сакавіка вечарам суд пераходзіць да допыту другога галоўнага абвінавачанага на справе «СВУ» Нікоўскага.

У мінулым Нікоўскі—намесьнік старшыні ЦК Украінскай партыі сацыялістых - федэралістых і міністар замежных спраў ураду «УНР». У 1920-21 годзе пры савецкай уладзе Нікоўскі быў членам кіраўнічага цэнтру контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «БУД» на тэрыторыі УССР, а з 1921 г. да 1924 г. ён быў членам замежнага «БУД». Яфрэмаў, карыстаючыся сваім становішчам віцэ-прэзыдэнта Украінскай акадэміі навук, дабіўся таго, што Урад УССР дазволіў Нікоўскаму выпушчаць на Украіну з заграніцы і працавець у ВУАН.

З прыездам Нікоўскага на Украіну быў створаны трывалы мост паміж унутранымі украінскімі контр-рэвалюцыйнымі элементамі і замежнай эміграцыяй. На Украіне Нікоўскі прадстаўляў сабой эмісара заграніччнага цэнтру «БУД».

У прад'яўленых яму абвінавачаньнях Нікоўскі прызнаўся. Паказаньні Нікоўскага прадстаўляюць сабой даволі доўгае і добра пабудаванае апавяданьне. Нікоўскі дапаўняе паказаньні Яфрэмава адносна паўстанцкай дзейнасьці «БУДу».

Далей Нікоўскі расказвае аб тым, што ў гасьцінае Яфрэмава і на яго кватэры ён сустракаўся з Гэнрыхам Юзэфскім, пры чым у яго склалася тады ўражаньне, што Юзэфскі сустракаецца з Яфрэмавым вельмі часта. Нікоўскі гаворыць, што ў гутарцы з ім, Юзэфскі яму паведаміў аб заключэньні саюзу паміж Пятлюрай і Пілсудскім, што польскія элементы шмат папрацавалі над гэтым саюзам і што ў выніку гэтага было наступленьне саюзных войск на Кіеў.

За час паказаньняў дзяржаўны абвінаваўца т. Міхайліка з дазволу суда перабівае абвінавачанага і робіць такую заяву: падсудны Нікоўскі цяпер гаворыць аб момантах работы на ун-эраўскіх арганізацыях на тэрыторыі Польшчы пасьля Рыскага дагавору. З прычыны таго, што польскі ўрад узяў на сябе абавязацельства не даваць магчымасьці бела-эміграцкім арганізацыям праводзіць работу на тэрыторыі Польшчы супроць Савецкага краю, дзяржаўнае абвінавачаньне, ня лічыць магчымым разглядаць такія моманты ў адкрытым пасяджэньні суда і прапануе гаварыць аб іх у закрытым пасяджэньні.

Пасьля нарады старшыня агалашае наступнае: Суд, абгаварыўшы заяву пракурора т. Міхайліка і супярэчаньні грамадзкага абвінаваўцы т. Любчанкі, пастанавіў:

«Выходзячы з таго, што пытаньні, асьветленыя падсудным Нікоўскім, у свой час былі аб'ектам абгаварэньня ва ўзаемаадносінах народнага камісарыята замежных спраў СССР з міністэрствам замежных спраў Польшчы і што гэтыя пытаньні ўжо страцілі характар дыпляматычнай тайны, а таксама і тое, што падасі, аб якіх ідзе гутарка, адбыліся на тэрыторыі Украіны, суд лічыць магчымым агалошча[illegible] а тав. Любчанкам і працягваць слуханьне паказаньняў падсудным Нікоўскага на адкрытым пасяджэньні». (ТАСС).

Савецкая ўлада ў 9 раёнах Кітаю

Поўдзень охоплены рэвалюцыйным рухам

Францускія самалеты бамбардуюць кітайскую савецкую тэрыторыю

ШАНХАЙ, 14. Сялянскі рух ахапіў амаль усе правінцыі поўдня. У 9-ці раёнах (усходні Гуандунь, Хайпуфын, Хэнань, захад Фуцзяну, паўднёсы-ўсход Гуансі, паўночны ўсход Хунаня, захад і паўночны ўсход Хубэя, поўдзень Цзянсі) існуюць савецкія тэрыторыі і савецкая ўлада, якая абараняецца Чырвонай арміяй. На раёне Лунчжоў (правінцыі Гуансі) напаў Індакітаю, дзе існуе савецкая ўлада, напалі 4 францускія аэрапланы, якія скінулі 400 бомб кожны. У раёне Шашы Янцзы (тут існуе савецкая ўлада) Чырвоная армія Хо-Луна была бамбардавана з боку японскай канаэрні. (ТАСС).

Улічыць памылкі Кастрычніцкага Райкому

Перавыбары партыйных органаў, якія пачаліся, маюць вялікае палітычнае значэньне. Справаздачна - перавыбарчая кампанія зьяўляецца праверкай палітычнай і клясавай баяздольнасьці кожнай партыйнай арганізацыі, экзамэнам яе гатоўнасьці [illegible]шуча змагацца з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі.

Цэнтральны камітэт КП(б)Б у сваім дырэктыўным лісьце даў выразныя паказаньні, на падставе якіх павінны быць праведзены перавыбары кіраўнічых парторганаў. [illegible] ЦК падкрэсьліў, што [illegible] умовай пасьпяховага выкананьня задач справаздачна - перавыбарчай кампаніі зьяўляецца шырокае разгортваньне самакрытыкі і поўнае захаваньне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў часе перавыбараў парторганаў.

Зараз перавыбары ў радзе раённых арганізацый ужо разгарнуліся. Таму надзвычай важна ў самым пачатку справаздачна - перавыбарчай кампаніі пазбегнуць усялякіх хібы і недахопы, выправіць дапушчаныя памылкі з тым, каб перавыбары кіраўнічых парторганаў правесьці на аснове палітычных задач, паказаных у дырэктыўным лісьце ЦК.

Пастанова бюро Менскага АК КП(б)Б аб скажэньні партыйнай лініі ў правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў Кастрычніцкай арганізацыі, заслугоўвае самае пільнае і сур'ёзнае ўвагі ўсіх арганізацый КП(б)Б.

Кастрычніцкі раённы камітэт партыі дапусьціў рад палітычных памылак. У Кастрычніцкім раёне былі дапушчаны грубыя скажэньні лёзунгу партыі аб самакрытыцы, аб чым «Зьвязда» пісала ў свой час. Зусім відавочна, што новае кіраўніцтва Кастрычніцкага райкому павінна было выкарыстаць справаздачна - перавыбарчую кампанію для таго, каб аброзіі дзейсный бальшавіцкай самакрытыкі да канца выкрыць дапушчаныя прарывы і выправіць іх, для таго, каб узьняць самакрытыку на небывалую вышыню.

У Кастрычніцкім раёне, дзе глупыцелі самакрытыкі на некаторых прадпрыемствах беспакарана цкавалі рабкораў, больш чым дзе-небудзь, патрэбна асабліва выразнасьць у пытаньнях самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, бо кожная новая памылка тольки нагоршыць тое становішча, якое стварылася ў Кастрычніцкім раёне.

На жаль новае кіраўніцтва Кастрычніцкай арганізацыі ня ўлічыла гэтых задач. Пастанова бюро Менскага АК КП(б)Б сьведчыць аб тым, што бюро Кастрычніцкага РК, у прыватнасьці, сакратар РК т. Дзічкоўскі, пры правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў Кастрычніцкай арганізацыі дапусьцілі грубое скажэньне партыйнай лініі і парушылі асноўныя дырэктывы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б і Менскага АК аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

ЦК тырана падкрэсьліў што трэба «забясьпечыць самы актыўны ўдзел усяе партыйнае масы ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі шляхам мабілізацыі [illegible] [illegible] і [illegible] ў [illegible] [illegible] а ў [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] ву да праверкі работы кіраўнічых парторганаў, вывучэньня розных абсягаў работы і актыўнага абмеркаваньня справаздач парторганаў».

Наперакор гэтай дырэктыве сакратар РК т. Дзічкоўскі ў ячэйцы вагонных майстэрань груба парушыў унутрыпартыйную дэмакратыю. Замест разгортваньня работы сярод усёй ячэйкі па пальоры пасьнікі, найбольш працаздольных кандыдатур у склад бюро, тав. Дзічкоўскі склікаў групу партыйцаў і вызначыў сьпіс кандыдатур у склад бюро ячэйкі.

Такім чынам, асноўная маса партыйцаў ячэйкі вагонных майстэрань была адхілена ад падрыхтоўчай работы. Наперакор катэгарычным дырэктывам аб шырокім абмеркаваньні кандыдатур у парторганы, сакратар РК дапускае папярэдняе абмеркаваньне кандыдатур бяз шырокага ўдзелу членаў ячэйкі. ЦК КП(б)Б прапануе «праводзіць перавыбары пры самым суровым захаваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, пры самым шырокім абгаварэньні асобных кандыдатур з забесьпячэньнем пэрсанальнага (а не па сьпісах) галасаваньня», а сакратар РК самастойна, бяз удзелу ячэйкі, вызначае сьпіс кандыдатур у склад бюро.

Кіраўніцтва бюро раённага камітэту не дало выразных дырэктыў аб перавыбарах парторганаў, што прывяло да цалага раду парушэньняў дырэктыўнага лісту ЦК КП(б)Б. Ня гледзячы на тое, што ў дырэктыўным лісьце выразна і зусім ясна сказана: «справаздачна-перавыбарчыя сходы, як у гарадзкіх ячэйках, так і вясковых праводзіць адкрытыя, з шырокім прыцягненьнем рабочай масы», бюро райкому дапусьціла правядзеньне закрытага справаздачна - перавыбарчага сходу на лямпавай фабрыцы.

Нарэшце, калі памылкі бюро райкому былі выкрыты, бюро не асудзіла і ня выправіла адразу гэтых памылак. Зусім правільна бюро Менскага АК КП(б)Б за скажэньне партыйнай лініі ў правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі абвясьціла вымову бюро Кастрычніцкага раённага камітэту партыі.

Гэта павінна паслужыць папярэджаньнем. Кожны РК павінен у працэсе перавыбараў пільна

Фашысцкі тэрор у польскіх турмах

Галадоўка 200 палітвязьняў у Вронках і Беластоку

БЭРЛІН, 11. Тут апублікаваны адкрыты ліст ЦК польскага МОПР'у аб надзвычай цяжкім становішчы, у якім знаходзяцца польскія палітзьняволеныя. Звыш 200 палітзьняволеных, якія пакутуюць у казэматах турмаў у Вронках і Беластоку — гаворыцца ў лісьце—праводзяць новую галадоўку. З кожным днём пагаршаецца фашысцкі рэжым, які ўстаноўлены ў польскіх турмах. Забаронены камуны палітзьняволеных і яны пазбаўлены правоў дзяліць атрыманыя прадукты. Забаронена мець агульныя кнігі і газэты і дапамагаць адзін аднаму ў самаадукацыі. У Беластоцкай турме з прычыны надзвычай кепскіх санітарных умоў палітзьняволеныя захворваюць. Сухотным не даецца ніякае дапамогі. Памерлі зьняволеныя Рудак і Возьняк, знаходзіцца пры сьмерці зьняволеная Райтэль.

Ад імя галадаючых палітзьняволеных у Вронках і Беластоку, ад імя звыш 6.000 кінутых фашысцкім урадам у турмы барацьбітоў рабочае клясы ў Польшчы, Заходняй Украіны і Зах. Беларусі ЦК польскага МОПР'у зварочваецца да працоўных мас усяго сьвету з палкім заклікам зараз-жа арганізаваць дэманстрацыі пратэсту супроць жорсткасьцяй польскага фашызму, з заклікам аказаць самую рашучую дапамогу гэраічнай барацьбе зьняволеных у Вронках і Беластоку.

Фашысцкі ўрад устанавіў паншчыну на вёсцы

Да ўсяе фашысцкае падатковае сыстэмы, якая душыць працоўных сялян у Польшчы, далучаецца яшчэ чыста феўдальная павінкасьці.

Урад Пілсудзкага дзеўна рыхтуецца да вайны супроць СССР і ўзмоцнена будуе стратэгічныя дарогі і шашы. Вельмі часта згоняюць сялян у часе разгару палявых работ, на будоўлю вайсковых дарог на адрэзку, які праходзіць каля іх вёскі.

Ад гэтых так званых «шарваркаў» (паншчына) могуць адкупіцца толькі кулакі. Працоўныя сяляне павінны гэтую паншчыну адрабляць. Сялянскія масы абкладзены яшчэ іншымі ваеннымі ніжарамі, як напрыклад, на коньны прызыву, на авіацыю і г. д.

Акрамя гэтае дзяржаўнае паншчыны, існуе таксама мясцовая паншчына на карысьць папоў і інш.

22-га сакавіка міжнароднай канфэрэнцыя прыяцеляў СССР

БЭРЛІН, 13. Міжнародная канфэрэнцыя прыяцеляў СССР склікаецца на 22-га сакавіка ў Эсэн.

Канфэрэнцыя французкае кампартыі

ЗА ШЫРОКУЮ ВЫРБОЎКУ РАБОЧЫХ МАС У ПАРТЫЮ

ПАРЫЖ, 13. На партыйнай канфэрэнцыі французкай кампартыі з дакладам па пытаньні аб арганізаваньных задачах партыі выступіў тав. Бэртон. Адзначаючы, што агульны лік членаў і кандыдатаў партыі складае 38.248 у тым ліку, як колькасьць беспартыйнага актыву, ахопленага партыйным уплывам, у масавых арганізацыях складае звыш 500.000 чал., тав. Бэртон заклікае партыю пачаць шырокую вырбоўку і арганізацыйна замацаваць уплыў партыі ў рабочых масах. Тав. Бэртон канстатуе, што партыя не заўсёды можа арганізацыйна ахапіць рух клясавае салідарнасьці, які стыхійна сваруўся вакол яе, як гэта мела месца, асьбліва ў перыяд пагрозы ісьпаньню «Юманіт», на карысьць якой сотні тысяч па капейках сабралі з мільёна франкаў і стварылі мясцовыя камітэты ў абарону «Юманіте». Апартуізм, нядбальства і неразуменьне ролі вытворчых ячэек, — падкрэсьліў дакладчык, — зьяўляюцца асноўнай прычынай арганізацыйнае слабасьці партыі і зьніжэньня яе колькасьці ў радзе раёнаў.

Тав. Бэртон далей адзначыў, што сацыяльны склад партыі застаецца нездавальняючым, паколькі недастаткова ахоплены найбольш эксплёатуемыя новыя пласты пралетарыяту, якія ўцягваюцца ў рацыяналізаваную капіталістычную вытворчасьць. Вопыт забастовак і вулічных сутычак паказвае, што навейшай палітэйскай тактыцы ваеннага задушэньня ўсіх выступленьняў павінна быць процістаўлена арганізацыя ў шырокім маштабе груп пралетарскае самаабароны.

Востры гаспадарчы крызіс У Польшчы

Працоўныя масы стогнуць пад цяжкасьцю вялізарнага вайсковага бюджэту

ВАРШАВА, 12. У сувязі з узраставучым гаспадарчым крызісам ва ўсёй Польшчы сярод дробнай і часткова сярэдняй буржуазіі абдываюцца характэрныя працэсы, супроцьлеглыя тым, якія адбываліся пасьля майскага перавароту Пілсудзкага, які саўпаў па спрыяльнай гаспадарчай канъюнктурай. Польскае мяшчанства масамі тады пакідала нацыянал-дэмакратычныя, хрысьціянскія, дэмакратычныя арганізацыі і пераходзіла на бок пілсудчыкаў.

У даны момант адбываецца дыямэтральна процілеглае зьявішча. Гарадзкая дробная буржуазія ахоплена апазыцыйнымі настроямі, якія вылёваюцца ў сходы пратэсту і нават у вулічныя «дэманстрацыі» супроць знакамітае палітыкі ўраду. Апошні вядзе лінію жорсткага выкананьня патрабаваньняў буйное буржуазіі і аграрыяў, абцяжарваючы край вялізарным ваенным бюджэтам, пазбаўляецца ўжо магчымасьці ў даных умовах крызісу стварыць сярод дробнай буржуазіі пры дапамозе крошак з барскага стала ілюзію гаспадарчае стабілізацыі.

Апошнімі днямі ўрад адмяніў усе гандлёвыя і фінансавыя ільготы, якімі да гэтага часу карысталася дробная буржуазія. У сувязі з гэтым, у радзе гарадоў, у прыватнасьці ў Варшаве, адбыліся мітынгі рамесьніцкіх і самаўпраўных арганізацый як польскіх, так і яўрэйскіх, на якіх выносіліся патрабаваньні пратэсту. У Пазнанскай воблаасьці гандляры ў знак пратэсту пастанавілі закрыць на некалькі гадзін усе магазыны. Будуць закрыты таксама ўсе кіно, тэатры. Усяпольскі цэнтральны саюз дробных гандляроў, саюз рамесьнікаў, аб'яднаньне рамесьніцкіх цэхі зьвярнуліся ў сойм з рэзалюцыяй пратэсту, у якой заяўляюць, што польскі гандаль і рамесьніцтва знаходзяцца на краю пропасьці, пры чым адзэй з галоўных прычын зьяўляюцца непасільныя падаткі. Рэзалюцыя патрабуе скарачэньня дзяржаўных выдаткаў. Ад гэтага патрабаваньня аддае ўжо пэўным і вельмі нянрыемным для ўраду дуцком.

Для характарыстыкі агульнага становішча цікава надаць лічбы пратэсту вакзалёў. У працягу 1929 году апрэтэставана 5.617 тыс. вэксалёў на суму 1.255 млн. злотых. Што датычыцца настроў вёскі, аб гэтым гаворыць пастанова хрысьціянскае партыі Пяста (Вітаса), якая патрабуе роспуску сойму і назначэньня новых выбараў. Да апошняга часу Пяст трымаўся ў цені. Побач з асноўнымі гаспадарчымі працэсамі радыкалізацыі шырокіх мас—усе гэтыя зьявішчы ўносяць [illegible] аб нарастаньні сур'ёзнага палітычнага крызісу. («Навэ Гэзэтэ»).

САМАЗАБОЙСТВЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ЛОДЗІ

ВАРШАВА. Газэта «Фольксэйтунг» паведамляе аб чатырох выпадках самазабойства беспрацоўных у Лодзі за адзін дзень.

Польска-нямецкі гандлёвы дагавор

БЭРЛІН, 12. Польска-нямецкія перагаворы, якія вяліся з перарывамі звыш 4-х год, прывялі, нарэшце, да выпрацоўкі гандлёвага дагавору. Мяркуючы папаведамленьням нямецкага друку, у аснову згоды пакладзен прынцып найбольшага ўпрывілеяваньня. Дагавор, аднак, не прадугледжвае скасаваньня забароны ўвозу ў Польшчу некаторых груп тавараў. Гэта адмена адбудзецца толькі пасьля таго, як Польшча далучыцца да жэнэўскай канвэнцыі аб скасаваньні ўсякага роду забарон на ўвоз і вываз тавараў. У аснове польска-нямецкага дагавору ляжаць артыкулы, якія датычаць увозу ў Нямеччыну з Польшчы сьвіней і вугалю. Дагавор прадугледжвае: у першы год увоз 250 тыс. сьвіных туш, у другі год—300 тыс., у трэці—350 тыс. Нямеччына гарантуе Польшчы разьмяшчэньне на сваім рынку гэтага кантынгэнту, сьвіных туш. Што датычыць увозу вугалю, то дагавор вызначае кантынгент у разьмеры 320 тыс. тон у месяц.

З свайго боку, Польшча дазваляе Нямеччыне ўвозіць пэўны кантынгент аўтамабільнай, тэкстыльнай і шкляной прамысловасьці і гатовага адзеньня.

Далей нямецкія параходныя кампаніі «Паўночна-Нямецкі Ллойд», «Гамбургска-Амэрыканская Лінія» і «Гамбургска-Паўднёва-Амэрыканская» атрымліваюць канцэсіі ў Польшчы. Падпісаньне дагавору павінна было адбыцца 11-га сакавіка ў Варшаве.

Становішча рацыяналізацыі вытворчасьці не адпавядае тэмпам рэканструкцыйнага пэрыяду

Узмацніць удзел пралетарскай грамадзкасьці ў рацыяналізацыі вытворчасьці

Становішча рацыяналізацыі вытворчасьці за апошнія два гады мала палепшылася. Трэба прызнаць, што гаспадарнікі гэтаму пытаньню амаль не аддаюць увагі, не даацэньваюць значэньня рацыяналізацыі ў справе выкананьня прамфінпляну і зьніжэньня сабекошту.

Трэба рэзка падкрэсьліць, што і ВСНГ не кіраваў гэтай справай. Зараз ячэйка ВСНГ на рацыяналізацыі вытворчасьці складаецца з аднаго таварыша і ня мае цвёрдага інжынэра. Агульны сход работнікаў рацыяналізацыі г. Менску ў свой час адзначыў, што гэта прычына зьяўляецца адным з галоўных тормазаў разгортваньня рацыяналізатарскай работы.

Характэрна пастанова нарады дырэктароў і старшых бухгальтароў фабрык Белгіпаніны: «справа рацыяналізацыі праводзіцца выпадкова бяз сыстэмы, бяз пляну, на гэту работу ня вылучаны адказныя працаўнікі і г. д. і г. д.» Гэту характарыстыку, па думцы ВСНГ, можна даць і іншым трэстам.

Як арганізацыйна афармляецца сетка рацыяналізатарскіх ячэек?

Зараз ячэйкі існуюць у большасьці трэстаў, на прадпрыемствах ёсьць 35 бюро па рацыяналізацыі. Для гэтай работы вызвалена толькі 15 працаўнікоў—лічба зусім недастаткова. Бюро з «вызваленымі» працаўнікамі зусім не праводзяць ніякай работы.

На заводзе «Беларусь» было назначана бюро рацыяналізацыі ў складзе прадстаўніка ІТР і двух рабочых. Зараз у сувязі з адыходам рабочых, бюро распалася. Часта фармальна «вызваленыя» рацыяналізатары загружаюцца іншымі работамі. Так, у Тэкстыльтрэсьце рацыяналізатары загружаны тарыфнарміраваньнем работ, пытаньнямі калдагорнай кампаніі, рэмпрэцкай пляцёлкі, розным перапіскай і г. д. (дакл. ВСНГ).

На Асінбудзе рацыяналізатар выконвае абавязкі прадстаўніка адміністрацыі ў РКК, у камісіі на вучоце сацыялістычнае (дакл. ВСНГБ)

Дырэктыва ЦКК УсеКП(б) аб камплектаваньні бюро рацыяналізацыі лепшымі інжынэрамі і рабочымі да апошняга часу дрэнна выконвалася; у складзе бюро рацыяналізацыі амаль няма інжынэраў. Доўгі час штаты бюро рацыяналізацыі не запаўняліся таму, што гаспадарнікі шукалі вельмі кваліфікаваных інжынэраў, не заўважваючы на прадпрыемствах талковых рабочых, якія могуць пры пэўнай падрыхтоўцы справіцца з гэтай работай.

Толькі ў апошні час пачалася планамерная падрыхтоўка кадраў рацыяналізатараў. У лютым г. г. адкрыліся курсы ВСНГ, дзе падрыхтоўваецца 60 работнікаў. У радзе ВНУ ўведзены асобныя курсы па падрыхтоўцы рацыяналізатараў. Гэта дасягнута пасьля рашучых націскаў з боку ЦКК КП(б)Б. «Оргстрой» арганізаваў прамысловыя цыклі на курсах рацыяналізатараў, прычым рад слухачоў курсаў ужо перайшоў на работу на прадпрыемствы ў якасьці рацыяналізатараў і прапаўнікоў ТНВ.

Спэцыяльных рацыяналізатарскіх контор, акрамя «Оргстроя» ў БССР няма, прычым характэрна, што ВСНГБ, пры існуючым становішчы, забараніў трэстам карыстацца паслугамі «Оргстроя».

У БССР ёсьць добраахвотнае рацыяналізатарскае таварыства «Асацыяцыя ЧАП», але работа т-ва слаба разгорнута ў зьвязку са слабой сувязью з прадпрыемствамі.

Дрэнна пастаўлена плянаваньне рацыяналізатарскай работы. Адсутнічае выразнае мэтадалёгічнае кіраўніцтва гэтай справай. Дагэтуль у прамфінпляны ня ўключаны пляны рацыяналізацыі. Часта аўтары пляну захапляюцца «сусьветнымі маштабамі» рэканструкцыі і зусім ня ўлічваюць магчымасьці рацыяналізацыі ды запаўняліся таму, што гаспадарнікі шукалі вельмі кваліфікаваных інжынэраў, не заўважваючы на прадпрыемствах талковых рабочых, якія могуць пры пэўнай падрыхтоўцы справіцца з гэтай работай.

Толькі ў апошні час пачалася планамерная падрыхтоўка кадраў рацыяналізатараў. У лютым г. г. адкрыліся курсы ВСНГ, дзе падрыхтоўваецца 60 работнікаў. У радзе ВНУ ўведзены асобныя курсы па падрыхтоўцы рацыяналізатараў. Гэта дасягнута пасьля рашучых націскаў з боку ЦКК КП(б)Б. «Оргстрой» арганізаваў прамысловыя цыклі на курсах рацыяналізатараў, прычым рад слухачоў курсаў ужо перайшоў на работу на прадпрыемствы ў якасьці рацыяналізатараў і прапаўнікоў ТНВ.

Спэцыяльных рацыяналізатарскіх контор, акрамя «Оргстроя» ў БССР няма, прычым характэрна, што ВСНГБ, пры існуючым становішчы, забараніў трэстам карыстацца паслугамі «Оргстроя».

У БССР ёсьць добраахвотнае рацыяналізатарскае таварыства «Асацыяцыя ЧАП», але работа т-ва слаба разгорнута ў зьвязку са слабой сувязью з прадпрыемствамі.

Дрэнна пастаўлена плянаваньне рацыяналізатарскай работы. Адсутнічае выразнае мэтадалёгічнае кіраўніцтва гэтай справай. Дагэтуль у прамфінпляны ня ўключаны пляны рацыяналізацыі. Часта аўтары пляну захапляюцца «сусьветнымі маштабамі» рэканструкцыі і зусім ня ўлічваюць магчымасьці рацыяналізацыі ды запаўняліся таму, што гаспадарнікі шукалі вельмі кваліфікаваных ресурсаў і арганізацыі працы. Амаль няма вучоту эфэктыўнасьці рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Дрэнна пастаўлен абмен рацыяналізатарскай практыкай прадпрыемстваў. Нельга лічыць нармальным такое становішча, калі адзін завод трапіць на выпрацоўку пытаньня ў 22 дні, а на другіх заводах ідзе 125 дзён.

Не вывучалася пытаньне аб увядзеньні непарыўнага патоку на вытворчасьці. Гэтае мерапрыемства праводзіцца толькі ў швейнай і часткова абутковай прамысловасьці. Надавычайна слаба разьвіта стандартызацыя на прадпрыемствах. Няма належнага кантролю ВСНГ і трэстаў за правядзеньнем стандартызацыі і якасьці прадукцыі. Розьніца ў даўжыні цэлы аднаго і таго-ж заводу—2 см., розьніца ў шырыні і таўшчыні—адзін см. і г. д.

Навукова-дасьледчая работа, контроль за вытворчасьцю, разгортваньне сеткі заводскіх і трэстаўскіх лябараторый—яўна недастатковыя. Паводле даных ВСНГБ, у 1928-29 годзе не скарыстана і палова сумы, адпушчанай на адкрыцьцё новых лябараторый і пашырэньне існуючых.

Важнейшая дырэктыва аб арганізацыі барацьбы са стратамі на вытворчасьці ня ставілася ва ўсім абёме перад прамысловасьцю ВСНГБ. Ёсьць выпадковая работа на аборы утыльсырцу і жалезнага лому.

Дапамога вынаходніцтва разьвіта вельмі слаба. Камісіі садзейнасьці вынаходніцтву на прадпрыемствах, паводле даных ВСНГБ, амаль адсутнічаюць, абс працуюць надзвычайна слаба. Ня ўцягнуты ў работу па рацыяналізацыі рабочыя-ўдарнікі.

Калі становішча рэспубліканскай прамысловасьці малюецца ў такіх чорных фарбах, то ў мясцовай прамысловасьці зусім няма работы па рацыяналізацыі.

У заключэньне трэба адзначыць, што становішча рацыяналізацыі прамысловасьці ня адпавядае тэмпам рэканструкцыйнага пэрыяду. Трэба дабіцца ўдзелу пралетарскае грамадзкасьці ў вырашэньні спраўы рацыяналізацыі і зьніжэньня сабекошту.

РАКАЎ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УЗБРОІМ НОВЫХ ЛЕНІНЦАЎ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ

Павышаючы тэарытычны ўзровень партыйных мас, мацней ударым па апартунізьме

ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА

Ленінскі набор даў КП(б)Б каля 5.000 перадавых рабочых і работніц ад варштату, батракоў і с.-г. рабочых. На асноўных заводах і фабрыках Беларусі сотні перадавых рабочых і работніц калектыўна ўступілі ў рады КП(б)Б.

Зусім ясна, што партыйныя арганізацыі павінны зараз заняцца сыстэматычным і глыбокім палітычным выхаваньнем новых тысяч партыйцаў-рабочых. Ахоп партыйнай вучобай камуністых ленінскага закліку 1930 г. —баявая палітычная задача. Новыя кадры камуністых — работніц і рабочых ад варштату, — якія ў ленінскія дні папоўнілі рады партыі, павінны быць выхаваны ў духу ленінізму і бальшавіцкай непрымірымасьці да ўсялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Аднак, цэлы рад фактаў сыгналізуе аб тым, што асобныя партарганізацыі не даацэньваюць гэтай важнейшай задачы. На некаторых прадпрыемствах яшчэ да гэтага часу ня створаны групы па палітвучобе і далёка ня ўсе партыйцы закліку 1930 г. ахоплены партасьветай.

На заводзе «Энэргія» толькі 4 партыйцы ленінскага закліку ўцягнуты ў партшколы. Ніякай выхаваўчай работы сярод новых партыйцаў не праводзіцца. Відавочна, што бюро педаацэньвае важнасьці палітычнага выхаваньня новых кадраў партыйцаў. Па такой недаацэнцы трэба рэзка ўдарыць. Грубую памылку бюро партколектыву «Энэргіі», якое сарвала партвучобу з новымі кандыдатамі, трэба выправіць.

Трэба проста сказаць, што частка раённых камітэтаў яшчэ не забясьпечыла 100-процантнага ахопу партыйцаў закліку 1930 г. партыйна-палітычнай вучобай, што асобныя райкомы не далі цьвёрдых і выразных дырэктыў у гэтым пытаньні. Кастрычніцкі райком (Менск) нічога пя ведае аб ходзе партвучобы ленінскага набору. Больш таго, Кастрычніцкі РК яшчэ пя ведае дакладна аб тым, колькі ў Кастрычніцкім раёне ўступіла рабочых і работніц у рады партыі ў ленінскія дні.

Бясспрэчна, што пры такіх адносінах да палітычнага выхаваньня ленінскага партнабору, партвучоба з новымі кадрамі партыйцаў будзе сарвана. Такія адносіны зьяўляюцца вынікам недаацэнкі партасьветы, супроць чаго мы павінны рашуча змагацца.

Трэба дабіцца самага глыбокага і карэннага пералому ў партвучобе і палітычным выхаваньні камуністых ленінскага закліку 1930 г. Тым больш, што пэўныя дасягненьні на гэтым вучастку ўжо ёсьць. Трэба ў гэтым напрамку адзначыць Фрунзаўскую партарганізацыю, якая дабілася ўжо 85-процантнага ахопу партвучобай ленінскага набору. Па Фрунзаўскай арганізацыі павінны раўняцца ўсе партыйныя арганізацыі. Дырэктыва партыі аб палітычным выхаваньні ленінскага набору і пагалоўным уцягненьні новых кадраў камуністых закліку 1930 г. у партшколы павінна быць поўнасьцю выканана.

ПЕРАІСЬЦІ НАБЕСЬПЕРАПЫНКУ

На заводзе «Камунар» за апошні час прынята ў партыю 80 рабочых. Усе новыя кандыдаты аднадушна выказалі жаданьне вучыцца. Зараз на заводзе арганізаваны дзьве групы, адна пры мэханічна - сьлясарным цэху, а другая — для іншых цэхаў прадпрыемства. Групы ўжо правялі па тры заняткі. Паведваньне груп здавальняючае. Рабочыя актыўна вывучаюць статут і праграму УсеКП(б). Але дрэнна тое, што частка новых кандыдатаў не ахоплена вучобай. З 80 чал. ахоплена партвучобай толькі 55 рабочых. Многія рабочыя працуюць у цэхах, якія перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень. Заняткі-ж груп не дастасаваны да бесьперапынкі.

Р—н.

Толькі 4

На заводзе «Энэргія» ў ленінскія дні некалькі цэхаў падалі калектыўныя заявы аб уступленьні ў партыю. Рады заводзкага парткалектыву папоўніліся дзесяткамі новых кандыдатаў партыі. Аднак, бюро партыйнага калектыву не паклапацілася аб тым, каб ахапіць камуністых ленінскага закліку партыйна-палітычнай вучобай. На заводзе, дзе 4 цэхі абвясьцілі сябе камуністычнымі і падалі калектыўныя заявы аб уступленьні ў партыю, з усіх новых кандыдатаў толькі 4 ахоплены вучобай.

А. М.

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

У ленінскія дні рабочыя машыннага цэху друкарні імя Сталіна калектыўна ўступілі ў рады партыі. У іншых цэхах і аддзяленьнях друкарні таксама ня мала перадавых рабочых і работніц уступілі ў кандыдаты партыі. Аднак, выхаваўчая работа сярод кандыдатаў яшчэ не разгорнута. Вучоба з новымі кандыдатамі не наладжана. Бюро парткалектыву, у прыватнасьці анорг, ня ведае, колькі арганізавана груп, ці ўсе кандыдаты ахоплены партвучобай, як праходзяць заняткі і г. д. Адсутнасьць усялякага кіраўніцтва жорстка б'е па разгортваньні вучобы з новымі кандыдатамі.

ПАРТЫЕЦ.

ПАСТАНОВА

аб'яднанага пасяджэньня прэзыдыуму і калегіі МАКК па справе саўгасу Мсьціж (Бягомльскі раён, Менскай акругі)

Адзначыць, што самакрытыка сярод рабочых у саўгасе Мсьціж парт'ячэйкай зусім ня была разгорнута. З боку насобных членаў бюро парт'ячэйкі (кіраўніка саўгасу т. Пятровіча) самакрытыка была заціснута, а лёзунг партыі [illegible] аб крытыцы і самакрытыцы [illegible] ня асобы, [illegible] ня ўзаемна, таксама рэдкалегіяй насьцянгазэты саўгасу Мсьціж гэты лёзунг быў заціснуты, аб чым сьведчыць незьмяшчэньне ў насьцянгазэце заметак, накіраваных супроць кіраўніка саўгасу Пятровіча. Парт'ячэйка пытаньнем самакрытыкі рашуча не займалася і не ўзьняла сабе палітычнай важнасьці гэтай справы, што спрыяла пасыўнасьці рабочых у разгортваньні барацьбы з усялякімі недахопамі ў гаспадарцы і незадавальненасьці ў паляпшэньні вытворчасьці.

Масавая праца сярод рабочых не праводзілася, гэтаму яшчэ спрыяла тое, што памяшканьне, якое было занята пад клюб, кіраўніком саўгасу Пятровічам было занята для сябе пад кватэру.

З боку Бягомльскага РК КП(б)Б ня было зьвернута належнай увагі на кіраўніцтва парт'ячэйкай і рабачкомам, што аб'ектыўна спрыяла заціску самакрытыкі і неразгортваньню выхаваўчай працы сярод рабочых саўгасу.

Цкаваньне Буйноўскага на глебе яго рабкораўскай працы не ўстаноўлена, адм. спагнаньні прыняты да Буйноўскага ў сувязі з парушэньнем апошнім працоўнай дысцыпліны. Замах на самагубства Буйноўскага зроблены ў сувязі з атрыманымі 3-5 студзеня спагнаньнямі.

Звальненьне Буйноўскага з працы пасьля замаху на самагубства зьяўляецца грубай бюракратычнай нячулаччу—праявай палітычнай блізарукасьці.

Прымаючы пад увагу, што бюро яч. КП(б)Б саўгасу Мсьціж ня справілася з пастаўленай партыяй задачай па разгортваньні крытыкі і самакрытыкі, мабілізацыі грамадзкасьці вакол гэтага важнага палітычнага пытаньня і барацьбы з усялякімі хваравітымі зьявішчамі, што спрыяла глушэньню самакрытыкі з боку пасобных членаў бюро ячэйкі (кіраўніка саўгасу т. Пятровіча і рэдкалегіі насьцянгазэты), у мэтах узмацненьня кіраўніцтва парт'ячэйкай саўгасу Мсьціж, разгортваньня самакрытыкі, культмасавай работы і паляпшэньня становішча насьцянгазэты калектыву саўгасу Мсьціж,—даручыць Бягомльскаму РК КП(б)Б.

а) Цяперашні склад бюро ячэйкі дазэмінова пераабраць, забясьпечыўшы яго склад заварышамі, адольнымі да рашучай барацьбы з усялякімі хваравітымі зьявішчамі.

б) Больш увагі аддаць практычнаму кіраўніцтву парт'яч. пры саўгасе Мсьціж узмацніўшы рабочы калектыў саўгасу партыйнай праслойкай.

в) Прыняць захады да сапраўднага разгортваньня самакрытыкі сярод рабочых саўгасу Мсьціж.

Прыняць захады да перавыбараў складу рэдкалегіі насьцянгазэты калектыву саўгасу Мсьціж і накіраваньня яе працы ў напрамку разгортваньня самакрытыкі.

Даручыць фракцыі Бел. Рэсп. Камсаюзу сельгаслесрабочых зараз-жа даць рабачкому саўгасу Мсьціж паказаньне ў найлепшым накіраваньні працы, разгортваньні культмасавай працы сярод рабочых, прыняўшы захады да забясьпячэньня адпаведнага памяшкання для гэтай мэты.

Кіраўніку саўгасу Мсьціж т. Пятровічу за заціск самакрытыкі, бюракратычныя адносіны да рабочых і звальненьне Буйноўскага ня рабочых і звальненьне Буйноўскага ня рабочых і звальненьне Буйноўскага ня

На барацьбу за прамфінплян

Ударны завод працуе не паўдарнаму

ПРЫЧЫНЫ ЛЮТАУСКАГА ПРАРЫВУ НА ЗАВОДЗЕ „БАЛЬШАВІК“

Што выявіла канфэрэнцыя ўдарнікаў заводу

Канфэрэнцыя скончылася пасьля 3-х дзён працы. Ударнікі заслухалі даклады заводскага «трохкутніка» аб рабоце заводу і па кожным дакладзе ўносілі свае «папраўкі». А «папраўкі» гэтыя былі такія, што востра ставілі пытаньне аб кіраўніцтве заводу.

Завод у лютым даў вялікі прарыў — у параўнаньні са студзенем ён выпрацаваў на 20 проц. менш прадукцыі. Прагулы растуць з кожным днём: калі ў студзені было 37 прагулаў, дык у лютым 63. Гэтыя лічбы выклікалі зусім правільную трывогу ўдарнікаў. Чым тлумачыць такую кепскую працу?

У сваіх прамовах ударнікі многа гаварылі аб дрэнным кіраўніцтве як адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, так і заводзкіх арганізацый. І гэта ў поўнай меры правільна. Намесьнік старшыні заўкому тав. Левін у сваім дакладзе сам прызнаўся, што:

— **Заўком у сваёй рабоце ні на каго не апіраўся**, усе пытаньні вырашалі 3-4 члены заўкому, рабочыя нас не падтрымалі (?) і таму мы маем прарыў у выкананьні прамфінпляну...

Якое падтрыманьне думаў сустрэць заўком ад ударнікаў, калі ня было кіраўніцтва?

— **Мы заўсёды гатовы кінуцца ў бой за зьнішчэньне недахопаў, але патрэбна кіраўніцтва, якога ў нас ня было,**— кажа рабочы тав. Каган.

— Нашы кіраўнікі шмат і красамоўна гавораць, а справы няма... Няма спрыяльных умоў для працы — пацьверджу і рабочы тав. Шымчак. І ён падае прыклад, як адміністрацыя ў ліпені 1929 году зрабіла заказ на сокаваркі, а пакрыўкі да іх заказала ў студзені 1930 г. Чаму ня разам?

Розныя пляны складаюцца ў **дырэктарскім габінэце** і не ставяцца на абгаворэньне мас. Прафарганізацыя фармальна ставіла пытаньне аб выкананьні прапаноў рабочых, адміністрацыя ў сваю чаргу абяцала, але прапановы рабочых ня выконваюцца. З аховаю працы на ўсё ў парадку. Машыны не агароджаны, сокаваркі не ізаляваны, не ізалюецца электрычныя правады.

З прычыны адсутнасьці выстарчальнага кіраўніцтва, на заводзе падае працдысцыпліна. Прагулы растуць нават сярод **ударнікаў**.

Вялікае значэньне на заводзе павінна адыграць хэмічная лябараторыя. Парадамі лябараторыі павінны карыстацца ўсе майстры цэхаў. Але, на жаль, вынікі аналізаў застаюцца ў лябараторыі і цэхі аб іх ня ведаюць. Калі-ж ударнікі выступілі на канфэрэнцыі з крытыкаю работы лябараторыі, загадчык яе тав. Арэшка заявіў наступнае:

— **Распускаць правакацыю аб лябараторыі на шматлюдных сходах я не дазволю. Раней, чым гаварыць аб лябараторыі, трэба ўзгадніць са мною...(?!)**

Гэты факт кажа аб тым, што на заводзе і з самакрытыкаю ня ўсё добра.

Пытаньне аб адзінаначальні не прапрацавана. Калі майстры заўважваюць нядбайнасьць з боку рабочага, яны адразу-ж бягуць у **заўком** са скаргаю. Яны ня хочуць браць на сябе адказнасьць за работу цэхаў, ня хочуць карыстацца сваімі правамі адміністратараў.

Вельмі шмат недахопаў адзначалі ўдарнікі ў сваіх выступленьнях. Асноўная віна за недавыкананьне прамфінпляну падае на кіраўніцтва заводам, якое не знаходзіцца на належнай вышыні.

Канфэрэнцыя распрацавала рад канкрэтных мерапрыемстваў для паляпшэньня работы заводу. **Ударнікі абавязаліся да 1-га мая выканаць прамфінплян на ўсе 100 проц.** Сваю назву ударнага заводу «Бальшавік» павінен апраўдаць.

А. МАНЬКОУ.

КІРЗЕЎ ЗНОЎ „КІРУЕ“

Значную частку віны ў невыкананьні прамфінпляну на «Дняпроўскай Мануфактуры» і занясеньні фабрыкі на чорную дошку мае БЫЛЫ ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ КІРЗЕЎ.

Але, як гэта ня дзіўна, зараз АРШАНСКІ АКРВЫКАНКОМ назначыў Кірзева ІНСПЭКТАРАМ УСЁЙ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ АКРУГІ.

І гэты бюракрат, былы дырэктар фабрыкі, ТОЛЬКІ ЎЧОРА ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ, мае нахабнасьць прысылаць нашай адміністрацыі такога роду паперку:

«ДУБРОВЕНСКАЯ МАНУФАКТУРЫ», ДУБРОЎНА

У дадатак да тэлефонных перамоў Інспэкцыя мясцовае прамысловасьці тэрмінова просіць паведаміць, ЯКІЯ БЫЛІ ПРЫЧЫНЫ ЗРЫВУ ВАШАГА ПЛЯНУ ЗА СТУДЗЕНЬ І ЛЮТЫ МЕСЯЦЫ, а таксама паведамце, што вамі ўжыта адносна выпраўленьня пляну і зьняцьця вашай фабрыкі з чорнай дошкі.

Інспэктар мясцовае прамысловасьці КІРЗЕЎ».

Ну, як гэта вам падабаецца? Як быццам, Кірзеў ня ведае аб прычынах зрыву прамфінпляну на нашай фабрыцы. І вось мы пытаемся: НАВОШТА ГЭТАГА БЮРАКРАТА ПАСАДЗІЛІ НА ТАКУЮ АДКАЗНУЮ ПАСАДУ?

Рабкор ДУБРОВІН.

Бюро патурае хвасьцістым „ЭНЭРГІЯ“ АДСТАЕ АД ПЛЯНУ

Асобныя камуністыя паказваюць адмоўныя прыклады

«Зьвязда» яшчэ ў сьнежні мінулага году сыгналізавала аб зрыве сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе **«Энэргія»** (гл. артыкул **«Памылкі кіраўніцтва»**, «Зьвязда» № 296). Бюро партыйнага калектыву не кіравала сацыялістычным спаборніцтвам. Многія партыйцы і камсамольцы «Энэргіі» ня прымалі ўдзелу ў спаборніцтве і не ўступалі ва ўдарныя брыгады. Барацьба з хвасьцізмам праводзілася зусім нездавальняюча.

Сыгналы «Зьвязды» **ня былі** пачуты. І зараз далёка ня ўсе камуністыя і камсамольцы зьяўляюцца ўдарнікамі. Парткалектыў «Энэргіі» ня выканаў дырэктывы ЦК аб 100-процантным уступленьні камуністых і камсамольцаў ва ўдарныя брыгады. На заводзе ёсьць 129 партыйцаў і 150 камсамольцаў. Але толькі 87 камуністых і 106 камсамольцаў уступілі ва ўдарныя брыгады. Рэшта яшчэ дагэтуль ня прымае ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Чаму? На гэта пытаньне бюро партыйнага калектыву ня можа адказаць, бо мала цікавіцца сацыялістычным спаборніцтвам і не вядзе барацьбы з камуністымі - «хвосьцікамі». Сакратар калектыву **т. Абрамовіч** на пытаньне —чаму ня ўсе партыйцы і камсамольцы ўступілі ва ўдарныя брыгады— адказаў: «Ня ўступілі таму, што ня хочуць».

Тав. Абрамовіч мае рацыю. Частка камуністых заводу «Энэргія» ўпарта адмаўляецца прымаць удзел у сацыялістычным спаборніцтве, цягнецца ў хвасьце і ня ўступае ва ўдарныя брыгады. Бюро партыйнага калектыву не змагаецца з гэтымі «камуністымі», якія праводзяць на практыцы лінію правага апартунізму.

У сьвятле гэтых фактаў зусім зразумелым становіцца тое, што «Энэргія» за 5 месяцаў гаспадарчага году выканала прамфінплян толькі на 90 проц.

А. М.

ПЕРАВЫБАРЫ ЗАЎКОМАЎ САЮЗУ МЭТАЛІСТЫХ

Толькі пад націскам —арганізацыі заводу „Пралетары“ пачалі падрыхтоўку

да барацьбу з нездаровымі настроямі

Перавыбарная кампанія нізавых прафячэек саюзу мэталістых мае вялікае палітычнае значэньне, напершае таму, што яна павінна зьяўляцца прыкладам для іншых саюзаў, падругое, перавыбары павінны даць рашучы пералом у рабоце заўкомаў на аснове новых форм і мэтадаў, на аснове прыцягненьня да прафработы шырокіх рабочых мас. На жаль, ня ўсе заўкомы і партячэйкі ўявілі сабе палітычную важнасьць гэтай кампаніі.

Аб рабоце машына-будаўнічага заводу «Пралетары» (Гомель) у «Зьвязьдзе» ужо шмат пісалася. Дрэннае кіраўніцтва заводам прывяло да таго, што прамфінплян за першы квартал быў недавыкананы на 17 проц. Ва ўсіх недахопах у рабоце заводу ў адноўкавай ступені з гаспадарнікамі вінаваты і заўком, які ня здолеў арганізаваць кантроль мас над вытворчасьцю і правільна кіраваць гэтымі масамі для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну.

Зараз гэты заўком трэба перавыбраць. Фактычна ёсьць ужо некалькі пастаноў аб роспуску гэтага заўкому, але паколькі падышлі перавыбары, заўком пераабіраецца на агульных умовах.

Да прыезду рабочай брыгады з заводу «Камунар» (Менск) для ўдзелу ў перавыбарах падрыхтоўка да гэтае працы мала не вялася. Таму агульныя сходы рабочых сыстэматычна зрываліся. Рабочая брыгада адразу-ж распрацавала план перавыбараў., з якім партыйныя і прафэсыянальныя кіраўнікі заводу згадзіліся толькі пасьля націску з боку акрпрафбюро і райкому партыі. Сакратар партклектыву заявіў: «пакуль мы не правядзем перавыбараў партарганізацыі, кіраваць перавыбарамі заўкому ня зможам». Такі настрой меўся і ў заўкоме, дзе брыгадзе заявілі — «вам даручылі, вы і праводзьце». Калі пытаньне было пастаўлена на бюро камсамольскага калектыву, апорг калектыву заявіў: «вы перавыбарамі заўкому вырываеце трохмесячнік культурнага паходу», і тут-жа на дасьлжэньні падаў заяву аб адстаўцы. Толькі з дапамогай акрпрафбюро і райкому партыі ўдалося брыгадзе ліквідаваць нездаровыя настроі ў кіраўніцтву заводу.

Зараз на заводзе зроблены пералом. Распрацаваны план падрыхтоўкі і перавыбараў. Адбыўся сход прафактыву, на якім быў заслуханы даклад аб новай структуры прафарганізацыі і аб удзеле прафактыву ў перавыбарчай кампаніі. Ва ўсіх цэхах і па эьменах праведзены гутаркі аб заключэньні паміж цэхамі дагавору на сацыялістычнае спаборніцтва па ўдзеле ў перавыбарах. Пасьля гутарак запісалася 180 добраахвотнікаў для праверкі работы заўкому. З добраахвотнікамі праведзена інструкцыйная нарада. Камсамольская і піянэрская арганізацыі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на час перавыбараў. Ва ўсіх цэхах разьвешаны плякаты, лёзунгі і плян перавыбараў. Падрыхтоўка добра асьвятляецца ў заводзкай друкаванай газэце.

Што датычыць работы заводу наогул, дык пакуль адносіны адміністрацыі будуць такімі-ж, якімі яны былі раней (аб чым ужо пісалася ў «Зьвязьдзе»), у рабоце заводу палепшэньня ня будзе. **Рабочая брыгада заводу «Камунар» патрабуе ад партыйных і прафэсыянальных арганізацый прыняць тэрміновыя меры да ліквідацыі ўсіх недахопаў, якія яшчэ маюць месца на заводзе «Пралетары».**

Рабочая брыгада:

І. Лаўрусэвіч, Б. Гершановіч.

Установы затрымліваюць узносы

па падпісцы на трэцюю пазыку

Кантрольная лічба па рэалізацыі 3-яй пазыкі індустрыялізацыі па г. Менску выканана са значным перавышэньнем. Напрыклад, па Менскай акруговай ашчадкасе рэалізавана аблігацый 3-яй пазыкі на 1.705.000 руб., што складае 124,4 проц. заданьня.

Аднак, з паступленьнем штомесячных адлічэньняў (узносаў) у крэдытныя ўстановы справа вельмі дрэнная. Нядоімка ўзносаў па 3-ю пазыку індустрыялізацыі дасягае вялізарнай сумы. Па аднэй акруговай ашчадкасе на 1-га сакавіка г. г. запазычанасьць за 40 калектывамі складае суму больш за 80.000 руб.

Такое зьявішча можна тлумачыць нічым іншым, як нядбайнымі адносінамі адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў да ўзносаў грошай.

Згодна абежніка НКФ СССР грошы, атрыманыя ад працоўных па падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, павінны ўносіцца адміністрацыяй не позьней 3-х дзён ад дня іх атрыманьня.

На справе-ж наглядаюцца выпадкі, калі ўзносы праводзяцца са спазьненьнем на два месяцы і больш.

Ня гледзячы на неадназначныя папамінаньні адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстаноў, за якімі лічылася запазычанасьць па ўзносах на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 1-га студзеня 1930 г., апошнія амаль ніякіх мер да ўрэгуляваньня гэтага пытаньня ня прымалі.

Неабходна органам РСІ і НКЮ прыняць рашучыя меры да ліквідацыі запазычанасьці па ўзносах на 3-ю пазыку індустрыялізацыі і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у затрыманьні грошай.

Г. К.

Рыс на балотах БССР

Каштоўныя на сваіх прыродных асаблівасьцях балоты Палесься ў цяперашні час набываюць вельмі вялікае эканамічнае значэньне на толькі для Беларусі, але і ўсяго СССР.

Навуковая мэліярацыйная думка ўстанавіла высокую с.-г. пэрспэктыву гэтых балот. Умовы клімату з мяккім, цёплым, без асабліўных перабояў у часе надворʼем дазваляюць гэтыя балоты скарыстаць пад інтэнсыўную культуру высокаштоўных с.-г. расьлін.

Выкарыстоўваючы гэтыя магчымасьці, урад БССР вызначыў шырокія мерапрыемствы на ўцягненьні балот Палесься ў культурны с.-г. зварот. Гэтыя балоты пэйзер разьмяркоўваюцца, як вельмі каштоўная зямельная тэрыторыя для арганізацыі на іх буйных сацыялістычных гаспадарак абожжавага, тэхнічнага і жывёлагадоўчага тыпу.

Апрача скарыстаньня над кармавыя ўжытковасьці на балотах мяркуецца арганізаваць буйныя абожжавыя і ільнаканапельныя гаспадаркі.

Рыс таксама аб'ўлецца адным з дэфіцытных прадуктаў у СССР і недахват яго далёка ня поўнасьцю пакрываецца ўвозам з-за мяжы.

Культура рысу ў СССР атрымала сваё цэўныя арганізацыйныя формы ў сувязі са стварэньнем з восені мінулага году пры НКЗ РСФСР Рысатрэсту, які цяпер ператвораны ў агульнасаюзны орган, які кіруе справаю разьвіцьця культуры рысу ва ўмовах СССР.

Пасевы рысу ў бягучым годзе мяркуецца разгарнуць на параўнальна вялікая тэрыторыі Сярэдняй Азіі. Паўночнага Каўказу і на Далёкім Усходзе.

Прыродныя ўмовы беларускага Палесься Прыпяцка-Дняпроўскага балотнага раёну дазваляюць разьвіваць на разьвіцьцё культуры рысу і на нас, у БССР, дзе і клімат параўнальна мяккі— вільготны, і запасы балотнай зямлі, і вады для арганізацыі саўгасаў па культуры рысу зусім даволі.

Поймы буйных рэк, што працякаюць у межах Беларусі — Дняпра, Прыпяці, Сожу амаль кожны год заліваюцца вадою.

Культура рысу якраз не патрабуе інтэнсыўнага асушэньня, а наадварот патрабуе абвадненьня. Рыс у пэрыяд свайго росту павінен быць пакрыты пластом вады каля 10 сантымэтраў на працягу доўгага часу ад пасеву да стадыі пачатку пасьпяваньня, а потым плошча асушваецца прыкладна за 12-20 дзён да ўборкі рысу.

Ва ўмовах поймаў палескіх буйных рэк значна лягчэй пры дапамозе ўгокаў стварыць крыніцы абвадненьня праз абкладываньне.

У межах СССР рыс вырошчваецца ў Малой Азіі, на Паўночным Каўказе і на Далёкім Усходзе — ва Ўсурыйскім краі. Зробленымі досьледамі ўстаноўлена, што на Далёкім Усходзе культуру рысу можна разгарнуць на плошчы 500.000 гэкт., у Малой Азіі — да 300.000 гэкт., на Паўночным Каўказе — да 200.000 гэкт.

Апрача гэтага, Волга-Ахтубінская пойма, дэльта ракі Волгі, пойма Дняпра і яго буйных утокаў, пачынаючы з Беларускага Палесься і да нізін Дняпра, паводле зробленых ужо досьледаў, могуць быць годнымі для культуры рысу.

Усе гэтыя пералічаныя магчымасьці гавораць за тое, што мы можам ня толькі забясьпечыць сябе гэтым надзвычайна цэнным прадуктам харчаваньня ў патрэбнай меры, але мець і лішак для экспарту рысу за мяжу. Трэба дзеля гэтага разгарнуць на ўсю шырыню культуру рысу праз стварэньне буйных мэханізаваных рысасаўгасаў на мясцох, дзе няма сумненьня, па прыродных умовах, для вырошчваньня рысу, як, напрыклад, Ўсурыйскі край, Закаўказье, Туркестан, а ў поймах буйных рэк нізін Волгі і Дняпра ў бліжэйшы час правесьці шырокую досьледчую работу па вяўленьні тэхнікі і эканомікі культур рысу ў гэтых раёнах у сувязі з іх прыродными ўмовамі.

Па ўмовах вырошчваньня ёсьць дзьве розныя відасьці рысу — балотна-вадзяны і горны. Абедзьве гэтыя розныя відасьці патрабуюць шмат вады, але горны рыс пры гэтым патрабуе павышанай вільготнасьці паветра.

Ва ўмовах БССР можна меркаваць, што можна з посьпехам вырошчваць балотны рыс: Ханкайда і іншых хуткасьпелых гатункаў, якія вывезены акадэмікам Н. І. Вавілавым з Кітаю ў часе апошняй яго экспэдыцыі. Гэтыя гатункі перераданы Менскай Цэнтральнай Дасьледчай Балотнай станцыі для досьледаў — ці магчыма іх культура на балотных глебах БССР.

Гатунак рысу Ханкайда, вывезены з Далёкага Ўсходу, выпрабоўваўся ў г. Канатопе (Чарнігаўшчына) ў два апошнія гады і даў здавальняючыя вынікі ў адносінах яго поўнага выспяваньня. Апрача таго, клімат Далёкага Ўсходу за пэрыяд вэгетацыі рысу ў Прыханкайскай нізіне, дзе гэты гатунак Ханкайда вырошчваецца і дае з і больш тон на гэктар збожжа, ва многім падобны да клімату Палесься.

Клімат Палесься ў адносінах колькасьці цяпла амаль не ўступае Далёка-Ўсходняй нізіне і адзначаецца, апрача таго, яшчэ і мяккасьцю, бяз рэзкіх хістаньняў цяпла і холаду ў часе.

Такім чынам, з гэтага боку, як быццам, і няма падстаў непакоіцца за невысьпяваньне рысу ў Палесьсі.

Лепшымі глебамі для балотна-вадзянога рысу служаць глебы ілаватыя каля рэк, ня вельмі лёгкія, з глебай, якая не прапускае вады. Такіх зямель на нашых вялікіх пойменых прасторах буйных палескіх рэк шмат.

Паводле досьледаў Сантаўскага мэліярацыйнага пункту на Д. У. тарфяністыя глебы аказаліся вельмі добрымі для культуры рысу. Ураджаі рысу, паводле даных работ гэтае ўстановы, павялічыліся з пераходам ад мінэральных глебы старапахатнай у атарфаваную з паніжаным элемэнтамі рэльефу.

Такіх тарфяных глеб таксама шмат у Палесьсі.

Найлепшы ўраджай рысу атрымліваецца на глебах цалінных, занятых натуральным балотным травастоем на берагох рэк, з вялікім узроўнем грунтовых вод.

Рэльеф павінен быць роўны з вельмі слабым ухілам, што дазволіць больш эканомна выконваць зямляныя работы, зьвязаныя з абвадненьнем. Няроўнасьць паверхні палёў, апрача таго, што выклічэ больш высокія затраты на абвалоўваньне з мэтаю затрыманьня вады на рысавых палёх пры абвадненьні можа выклікаць непарматнасьць высьпяваньня рысу, з прычыны розных глыбінь пласту вады, якія пакрываюць рысавыя палі.

Тып палескіх пойменых балотных глеб, лугавая расьліннасьць з адзнакамі забалочаньня і ўхіл мясцовасьці зусім адпавядаюць гэтым патрабаваньням культур рысу.

Рыс можа вырошчвацца ў асобным севазвароце з чаргаваньнем іншых расьлін, якія не патрабуюць добрай асушкі. Рыс можа вырошчвацца з лугавымі травамі, якія выносяць затапленьне і больш высокі ўзровень грунтавых вод, як напрыклад: бэкманія, канарэечнік трасьнікоры, палявіца белая і мятлікі — балотны і звычайны.

Зусім ня дрэнна разам з культурай рысу весьці і рыбную гаспадарку. Тут можна было-б пераняць практыку высны Малагаскару і Інда-Кітаю, дзе рыс высаджваюць сажанцамі ў мокрую пухкую зямлю. Па меры росту сажанцаў напускаецца на поле вада з каналаў пластом 20-30 сантымэтраў, а мясцамі і некалькі вышэй. Кожнае такое рысавае поле прадстаўляе сабою дробны вадаём з вадой, якая паволна цячэ і роўнамерна награваецца паверхнёю. У вадзе пасяляюцца розныя найпрасьцейшыя арганізмы, чэрві, казюлькі з іх чарвамі і інш., якія і служаць стравай для рыбы, што трапляе ў гэтыя вадаёмы. Прысутнасьць рыб ня шкодзіць рысу, а наадварот. Гэтыя рыбы па сваёй пражорлівасьці могуць даць добрае ўгнаеньне для рысу.

Такім чынам, упікаючы бязьзьменнасьці культуры рысу на адным месцы, што нельга дапускаць, з прычыны магчымай засьмечанасьці палёў, якое рыс ня выносіць, можна было-б рэкамэндаваць у Палесьсі пры рысасеянні наступны севазварот: 1) рыба, 2) рыс, 3) лугавыя травы на ўкос гады на 3 і потым на 1-3 гады пашу. Месца для пасеваў рысу звычайна вызначаецца ў поймах рэк у паніжаных мясцох рэльефу, з мэтаю зручнага карыстаньня вадою гэтых рэк або іншых суседніх вадаёмаў. Выбраная пад культуру рысу тэрыторыя разьбіваецца на палосы прыкладна ў 500 кв. мэтраў шляхам пабудовы прадоўжных упоперак ухілаў дамб або валоў для загараджэньня стоку вады і папярочных валікаў.

Пэрспэктыва рысакультур у паўднёвай частцы БССР у Палесьсі — вельмі прывабная і нам прадстаўляецца гэта справа зусім магчымай да ажыцьцяўленьня.

Для праверкі многіх яшчэ няясных пытаньняў як тэхнікі, так і эканомікі справы рысасеяньня ва ўмовах клімату і глеб Беларускага Палесься, Цэнтральнай Балотнай Дасьледчай станцыяй з бягучага году мяркуецца пачаць дасьледчую работу з культурай рысу ў поймі Прыпяці, Дняпра, Сожу і на некаторых іншых балотах БССР.

Аграномічныя сілы і зямельныя работнікі Палесься не павінны прайсьці моўчкі міма пытаньня магчымасьці ў нас у БССР вырошчваньня рысакультур. Кожны павінен прыняць на магчымасьці ўдзел і даць дадамогу ў справе вяўленьня на месцы магчымасьці вырошчваньня рысу пры запладаньне пробных пасеваў рысу і нагляду за ростам і патрабаваньнямі гэтай культуры да глебы, вады і клімату.

П. САЎКІН.

ЭЬВЯЗДА.

Рост і ўзмацненьне калгаснага руху немагчымы без ліквідацыі скажэньняў і перагібаў

Скажэньні-вынік злачынлівага парушэньня палітычнай партыі, пастаноў яе кіруючых органаў

„НЯМА ЧАСУ ДЛЯ ПРАЦЫ СЯРОД БЕДНАТЫ“

Члены Кацелеўскага сельсавету, Горацкага раёну (Аршаншчына) зусім не разумеюць ролі і значэньня беднаты ў справе калектывізацыі вёскі. Пры правядзеньні сходаў, на якіх ставілася пытаньне аб калектывізацыі, мела месца адміністраваньне і заталкваньне сялянства.

За сваё выступленьне быў адведзены ў міліцыю бядняк Балашкін Янка, які не вразумеў сутнасьці калектывізацыі.

Член Горацкага райкому КП(б)В Іракаў прымушаў беднякоў даваць падпіску аб тым, што яны згодны выселіцца з межаў раёну, калі ня пойдуць у калгас.

Гэта суправаджалася прымірэнчымі адносінамі да кулака. Некаторыя калгасы засьмечаны кулацкімі элемэнтамі. Так, у Кацелеўскі калгас прыняты кулак Кавалёў, які трымаў 2-3 сталых батракоў. Такую важную кампанію, як чыстка калгасаў ад кулацтва і антысавецкага элемэнту, сельсавет праводзіць бяз жаданае палрыхтоўкі і ўдзелу батрацка-бядняцкіх груп, якія да гэтага часу ў калгасах яшчэ ня створаны.

На пытаньне, чаму ў часе чысткі калгасаў не праводзіліся сходы беднаты, члены сельсавету заяўляюць, што райкалгас патрабуе хутчэй дасылаць весткі аб выніках чысткі і таму няма калі праводзіць бядняцкіх сходаў, якія займуць шмат часу (!).

Усё гэта паслужыла прычынай таму, што па некаторых вёсках асобныя беднякі пачалі выпісвацца з калгасаў.

ЧАР.

З калгасаў вычысьцілі сераднякоў

У Чырвона-Слабодзкім раёне (Бабруйшчына) пры чыстцы калгасаў была праведзена вялікая расьлумачальная работа сярод калгасьнікаў. Пытаньне аб чыстцы абмяркоўвалася на раённай канфэрэнцыі груп беднаты, на сходах калгасьнікаў. У буйных калгасах былі ўтвораны ініцыятыўныя групы з беднякоў і серадняко-актывістаў для дапамогі раённай камісіі па чыстцы. Перад чысткаю ў калгасах праводзіліся сходы груп беднаты. Ужо праведзена чыстка па 5-ці калгасах з якіх вычышчана 13 кулакоў і 2 былыя паліцэйскія.

Але не абышлося і без палітычных памылак. У Вычацінскім сельсавеце камісія па чыстцы дрэнна ўявіла сабе свае задачы. У выніку камісія вычысьціла з калгасу 8 сераднякоў за тое, што калісьці яны былі супроць абагульваньня і калектывізацыі. Зараз, зразумеўшы сутнасьць калектывізацыі і работу ў калгасах, гэтыя сераднякі зьяўляюцца прыкладнымі калгасьнікамі. Такі падыход камісіі, зразумела, палітычна шкодны і толькі на руку нашым клясавым ворагам. Раённая камісія па чыстцы павінна бездакладна выправіць гэтыя памылкі. 8 сераднякоў, якія бяз усякіх падстаў выключаны з калгасаў, павінны быць адноўлены ў правах калгасьнікаў.

Брыгадзір «Зьвязды» **АПЯКІН.**

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ

МАЗЫР. (Наш кар.). У Капаткевіцкім раёне (Мазыршчына) мясцовыя працаўнікі канфіскацыю сродкаў вытворчасьці ў кулакоў і перадачу іх у калгасы абярнулі ў дзяльбу кулацкай маемасьці паміж сабою. Загадчык зямельнаю часткаю РВК Харланчук пры раскулачваньні ўзяў сабе два кажухі, з якіх адзін аддаў вартаўніку РВК. Другі працаўник райвыканкому проста заехаў у вёску Новасёлкі і забраў сабе калёсы, канфіскаваныя ў кулака.

У Лучыцкім сельсавеце спрытныя адміністратары пры раскулачваньні закранулі і серадняка. Рад сераднякоў трапіў у кулакі і былі раскулачаны.

Абураючы факт меў месца ў Чарэвіцкім сельсавеце, дзе праводзіла калектывізацыю жанарганізатар райкому КП(б)В тав. Каваленка.

На сходзе сялянкі задалі Каваленка запытаньне: «Куды мы дзенем нашых старых і хворых, калі пойдзем у калгас?»

Гора-калектывізатар Каваленка, замест растлумачэньня сялянкам аб рабоце і жыцьці ў калгасе, дае агіднейшы адказ: «Мы іх пусьцім на мыла».

Зразумела, такое «тлумачэньне» Каваленкі выклікала абурэньне сярод сялян. Рад калгасьнікаў падалі заявы аб выхадзе з калгасу.

Мы патрабуем безадкладнага **прыцягненьня Каваленкі да судовае адказнасьці за дыскрэдытаваньне савецкай улады**, за контрэвалюцыйнае выступленьне на сялянскім сходзе.

М. В.

Дубровенскія урокі

Бядняцка - серадняцкія масы Дубровенскага раёну (Аршаншчына) рашуча ўступілі на шлях сацыялістычнае перабудовы вёскі. Беднякі і сераднякі Дубровеншчыны масамі пайшлі ў калгас.

Але, на жаль, партыйнае і савецкае кіраўніцтва Дубровенскага раёну аказалася нездольным для таго, каб стаць на чале гэтага магутнага руху бядняцка-серадняцкіх мас. Асноўнай грубай палітычнай памылкай працаўнікоў Дубровенскага раёну зьявілася **поўная недаацэнка ролі беднаты ў калектывізацыі вёскі.** У выніку гэта прывяло да таго, што **ўсякая работа сярод беднаты пры арганізацыі калгасаў адсутнічала.** Батрацтва і беднота выпалі з-пад увагі Дубровенскага партыйнага і савецкага кіраўніцтва.

Пры арганізацыі калгасаў у большасьці сельсаветаў раёну ня была праведзена шырокая растлумачальная работа сярод бядняцка - серадняцкіх мас вёскі. Мясцовыя працаўнікі абмяжоўваліся толькі галасаваньнем сялян за калгасы. Нічога ня было зроблена для таго, каб замацоўваць арганізаваныя калгасы. У радзе месц гэта прывяло да поўнай дэзарганізацыі работы калгасаў. Праўленьні калгасаў бязьдзейнічалі, ня ведалі, што рабіць, як пачынаць работу. Мясцовыя працаўнікі, не замацаваўшы першапачатковай формы калектыўнае гаспадаркі —сельска - гаспадарчай арцелі, імкнуліся перавесьці ўсе калгасы ў камуны, замест абагульваньня асноўных сродкаў вытворчасьці. Пачалі абагульваць усё аж да парасят, курэй і г. д. У некаторых мясцох нават пачыналі з курэй. Такое «абагульваньне» ў радзе месц не абышлося бяз голага адміністраваньня, прымусу.

Побач з перагібамі ў адносінах серадняка і бедняка, у Дубровенскім раёне наглядаліся таксама прымірэнчыя адносіны да кулака. У рад калгасаў і іх кіраўнічыя органы пралезьлі кулакі, якія з першых-жа дзён пачалі контр - рэвалюцыйную дэзарганізатарскую работу ўнутры калгасаў.

У той самы час, калі Дубровенскае партыйнае і савецкае кіраўніцтва не вяло амаль ніякай растлумачальнай работы сярод бядняцка - серадняцкіх мас вёскі, кулак разьвіваў шалёную агітацыю, выкарыстоўваючы кожную памылку мясцовых працаўнікоў, кожны іх няправільны крок. Гэта прывяло да таго, што ў некаторых мясцох беднякі і сераднякі паддаліся на кулацкую правакацыю, пачалі выходзіць з калгасаў і разьбіраць абагуленае насеньне і жывёлу. Мясцовыя працаўнікі аказаліся нездольнымі супроцьпаставіць кулацкай агітацыі сапраўдную бальшавіцкую растлумачальную работу сярод асноўных мас сялянства.

Беднякі і сераднякі Дубровеншчыны праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да новага статуту сельска-гаспадарчай арцелі. Газэты з новым статутам сельска - гаспадарчай арцелі чытаюцца беднякамі і сераднякамі з вялікай цікавасьцю. Нават тыя беднякі і сераднякі, якія, паддаўшыся на кулацкую правакацыю, выйшлі з калгасу, зараз заяўляюць, што яны за калгасы, за калектывізацыю, але не за такую, як раней праводзілі ў Дубровеншчыне.

Як-жа Дубровенскае савецкае і партыйнае кіраўніцтва выпраўляе грубейшыя палітычныя памылкі і скажэньні лініі партыі.

Некаторыя працаўнікі замест таго, каб выправіць дапушчаныя памылкі, яшчэ больш іх паглыбляюць. У Дубровеншчыне яшчэ і **зараз марудзяць з пераводам калгасаў на новы статут сельска - гаспадарчай арцелі. Мясцовыя працаўнікі ўпарта ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду.**

У раёне зараз праводзіцца чыстка калгасаў. І тут дубровенскія працаўнікі зноў дапускаюць палітычныя памылкі. Замест таго, каб праводзіць чыстку пад сьцягам выкрыцьця кулацкіх элемэнтаў у калгасах, замест таго, каб выкінуць з калгасаў і іх кіруючых органаў кулакоў, якія туды пралезьлі, у Дубровеншчыне пры чыстцы робіць упор на выключэньне з калгасаў тых асобных беднякоў і сераднякоў, якія часамі паддаваліся кулацкай агітацыі, замест растлумачальнай работы сярод іх. **Да работы з беднатою нават і зараз не прыступілі. У калгасах груп беднаты яшчэ няма.**

Мы лічым, што Дубровенскае партыйнае і савецкае кіраўніцтва, якое аказалася нездольным стаць на чале бядняцка - серадняцкіх мас, якое замест сапраўднай растлумачальнай бальшавіцкай работы пры арганізацыі калгасаў займалася адміністраваньнем і дэкрэтаваньнем — такое кіраўніцтва павінна быць безадкладна зьменена.

Мы ставім таксама пытаньне і аб тым, дзе было партыйнае і савецкае кіраўніцтва Аршанскай акругі ў часе прарыву ў Дубровеншчыне. Мы ставім пытаньне аб тым, чаму акруговымі арганізацыямі своячасова ня былі прыняты меры, каб выправіць лінію партыі ў Дубровеншчыне, каб спыніць адміністрацыйныя практыкаваньні дубровенскіх упцераў Прышыбеевых.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Не перашкаджаць сялянам прадаваць прадукты на рынках

Дырэктывы партыі і ўраду ясна паказвалі і паказваюць на тое, што нельзя рабіць ніякіх перашкод пры продажы сялянствам сваіх таварных лішкаў на рынках.

Аднак, у некаторых мясцох, як напрыклад, у Мазырскай і Бабруйска акругах былі выданы пастановы, які цалкам забаранялі ўсялякі продаж мяса з вазоў. Зразумела, што такія пастановы прывялі да таго, што патаемны забой жывёлы ня толькі не паменшыўся, але значна павялічыўся. У некаторых мясцох сялянства амаль што спыніла падвоз мяса і мясных прадуктаў на рынк.

У некаторых мясцох нада прыткі адміністратары даходзілі да таго, што рэквізавалі на некалькі фунтаў мяса сала ў сялян, якія прывозілі гэтыя прадукты на рынак.

Зразумела, што такія пастановы зьяўляюцца памылковымі. З такімі перагібамі павінна быць паведзена рашучая барацьба.

Ясна, што і надалей трэба ня толькі не паслабляць, але нават узмацніць барацьбу супроць кулака і спекулянта, якія зрываюць нашы загатоўкі і плянавае забесьпячэньне, якія імкнуцца дэзвіншчэньня жывёлы.

Але побач з гэтым, ня можа і не павінен быць абмежаваны вольны продаж і продаж мяса і іншых прадуктаў сялянамі, якія прывезьлі свае таварны лішкі на рынкі ў горад.

Забарона сялянам продажу на рынках толькі на руку спэкулянтам, якія пагалічваюць цэны на 100 і больш процантаў.

АСУШКА 25.000 ГЭКТАРАЎ БАЛОТНАЕ ПЛОШЧЫ

Сёлета на БССР намечаецца рад буйных гідратэхнічных работ на асушцы балот, на рэгуляваньні рэк, пракладцы новых магістральных каналаў і г. д. На гэтыя мэты асигнавана 5.300.000 рублёў. У плян работы ўключана рэгуляваньне 35 рэк. Інтэнсыўная асушка будзе ахоплена 25.000 гэкт. балот у саўгасах і калгас

Новы камандзір 7-й Самарскай кавдывізіі

Назначаны на пасаду камандзіра 7-й Самарскай кавдывізіі Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі нарадзіўся ў 1896 годзе ў сям'і чыгуначніка. Бацька—ма-

шыністы, памёр у 1914 г. З 14-ці год тав. Ракасоўскі стаў працаваць на розных работах.

У 1914 г. прызваны быў у старую армію, дзе праслужыў да канца імперыялістычнай вайны. Зараз-жа пасля арганізацыі атрадаў Чырвонай гвардыі ўступіў у кастрычніку 1917 г. у Чырвоную гвардыю, а пасьля ў Чырвоную армію.

У камуністычную партыю ўступіў у сакавіку 1919 году.

За баявыя заслугі ўзнагароджаны 3-ма ордэнамі Чырвонага Сьцягу.

У часе канфлікту на К.-У. чыг. камандаваў №-скай кавалерыйскай брыгадай і за яе баявыя ўчынкі ўзнагароджаны трэцім ордэнам Чырвонага Сьцягу.

Адкрылася канфэрэнцыя фізкультурнікаў

Учора ў клюбе мэталістых адкрылася першая ўсебеларуская міжсаюзная канфэрэнцыя фізкультурнікаў. На канфэрэнцыю зьехалася звыш 120 дэлегатаў з усіх округ Беларусі.

На вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала прывітаньні: ад Менскага акруговага камітэту партыі т. Каменштэйна, ад ЦК КЛСМБ т. Палякова, ад бюро фізкультуры ЦСПСБ т. Ешчына, ад ВСФК тав. Лева. Потым з дакладам аб чарговых задачах фізкультурнага руху выступіў старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў.

Мануфактура для малочных т-ваў

Наркамгандаль БССР адпусьціў Белмалжівсаюзу 2 вагоны мануфактуры для ўзмацненьня загатовак масла і малака. Мануфактура будзе выдавацца малочным т-вам для прэм'яваньня членаў

МЕНСК

ПРАЦА Ў ДЗЕНЬ 18 САКАВІКА

Наркампрацы БССР паведамляе, што 18-га сакавіка—дзень Парыскай Камуны—прадпрыемствы і ўстановы, якія перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень, таксама прадпрыемствы, якія перайшлі на пяцідзённы з перапынкам вытворчы тыдзень працуюць нармальна.

Ва ўсіх іншых прадпрыемствах пытаньне аб працы ў дзень 18-га сакавіка павінна вырашацца на агульных сходах рабочых данага прадпрыемства.

Будаўніцтва новых бойняў і халадзільнікаў

Саюзны Наркамгандаль канчаткова вырашыў пытаньне аб пабудове ў Віцебску новага халадзільніку на 1.000 тон, бойні і каўбаснай фабрыкі. Да будаўніцтва ўсіх гэтых прадпрыемстваў будзе прыступлена з мая бягучага году. Праекты вызначаных пабудоў ужо распрацоўваюцца ў Маскве. Будаўніцтва Віцебскага мясного камбінату абойдзецца ў 2½ мільёны рублёў.

ПЭДАГОГАЎ З УСТАНОЎ—У ШКОЛЫ

У зьвязку з неабходнасьцю выканаць плян усеагульнага навучаньня і са значным недахопам пэдагогаў у 1-м і 2 канцэнтрах сяміклас, СНК БССР даручыў Наркампрацы і Наркамасьветы правесьці усе ўстановы і выявіць усіх асоб з вышэйшай і сярэдняй пэдагагічнай адукацыяй, якія працуюць не па сваёй спэцыяльнасьці, каб перакінуць іх на работу ў навучальныя ўстановы.

За дзень

Ліквідацыя Гомельскага Рабочага банку. Гомельскі рабочы банк рэарганізуецца ў аддзяленьне Белкамунбанку. Рэарганізацыя будзе скончана да 1-га красавіка.

Дапамога рахункаводам, якія выехалі ў калгасы. У дадатак да сродкаў адпушчаных саюзам саўгандальслужачых СНК адпусьціў 17.500 рублёў на выплату розьніцы па зарплаце рахункаводным працаўнікам, якія выехалі на пастаянную работу ў калгасы.

НОВЫ СТАРШЫНЯ ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР.

Тав. С. Л. Гольдберг

В. Ф. АШМАРЫН

Партыя страціла самаахвярна адданага члена тав. **Ашмарына**, старога чакістага, мастацтвазнаўца і літаратурнага работніка, аднаго з першых будаўнікоў савецкае кінематаграфіі.

Вітольд Францавіч Ашмарын ужо на гімназычнай лаўцы прымае ўдзел у рэвалюцыйных гуртках. У 1902 годзе за удзел у студэнцкіх гуртках высылаецца ў Балаганск і Ніжнявудзінск, дзе пад уплывам Сольца і іншых бальшавікоў азначаецца, як член нашае партыі, 1905 год застае яго прапагандыстам у Сормаве.

1918 год тав. Ашмарын на Заходнім фронце, спачатку з вінтоўкай у руках—потым—адзін з арганізатараў савецкае ўлады ў Беларусі і рэдактар газэты «Зьвязда».

1919-21 г. г. ён працуе сакратаром рэвалюцыйнага камітэту Беларусі, паравень вядзе работу ў ЧК Беларусі і зьяўляецца членам кантрольнае камісіі КП(б)Б, сумяшчаючы гэту работу з рэдагаваньнем «Зьвязды».

У 1921 годзе тав. Ашмарын рэдагуе «Советскую Сибирь». З 1921 г. па 1924 г.—тав. Ашмарын на адказных пасадах у АДПУ. З 1924 году да дня сьмерці—на адказнай работе ў ЦК УсеКП(б) з пазначным перарывам у 1926 годзе, калі ён арганізоўвае і рэдагуе орган ЦК ССТС «Нашу газету».

З 1924 г. па 1929 г. тав. Ашмарын працуе ў Замаскварэчы членам і старшынёю камісіі па прыёме ў партыю (пры райкоме, а таксама на Металялампе, капсэрным заводзе, Аверкаўскай фабрыцы). У 1928 г.—у камісіі па праверцы кандыдацкага складу, выконваючы асобныя заданьні райкому і МК УсеКП(б). У сябе, у ячэйцы ЦК УсеКП(б), чатыры разы выбіраецца ў члены бюро.

Скромны, бязупрэчны ў быце, чулы ў адносінах да таварышоў, ён быў цьвёрды і наўступчывы, калі справа ішла аб інтарэсах партыі.

Яго сьмерць вельмі цяжка для партыі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

17 сакавіка г. г., а 8 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, склікаецца **МІТЫНГ-ПЕРАКЛІЧКА** калектываў саюзу саўгандальслужачых па пытаньні аб чыстцы апарату.

У парадку дня: 1) Даклад НК-РСІ (т. Хмялеўскі).

2) Рапарт МК і ГК ЦРК, ВСНГ, Наркамгандалю, Белкаапсаюзу і камісій саадпічпчаньня пры гэтых установах, аб ходзе падрыхтоўчай работы да чысткі апарату.

Дом Асьветы—Сёньня, а 7-ай гадзіне ўвечары адбудзецца **АДКРЫТЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ КП(б)Б ПРАЦАСЬВЕТЫ** з наступнай абвесткай дня:

1. Ліст ЦК КП(б)Б.
2. Справаздача Бюро Парткалектыву.
3. Перавыбары Бюро Ячэйкі.
4. Бягучыя справы.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі гор. Менску.

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ.

АД МЕНСКАЕ АКК КП(б)Б

Мен. АКК КП(б)Б просіць наступных таварышоў зьявіцца ў АКК, або паведаміць свае адрасы (месца працы, ячэйка): **Янубсона** (прыбыў з Гомельскай арганізацыі), **Качука** (б. сакратара РК КП(б)Б у Слуцку), **Серафімава** (працаваў раней у Полацкай акрузе па лініі асьветы), **Райскага** Віпнаса (быў у Койданаўскай райпартарганізацыі), **Маўчана** Івана Клімавага (б. вярбоўшчыка рабсілы для лесазагатовак на Сьмілавіцкім раёне).

Просьба да ўсіх таварышоў, якія ведаюць месцазнаходжаньне гэтых партыйцаў, паведаміць у АКК КП(б)Б.

Менская АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне парттройкі, якое адбудзецца 20-га сакавіка ў 18 гадз. у канцылярыі АКК (Энгельса, 28), наступных т. т.:

Быкава С. П. і Гайдука П. І. (яч. заводу «Камунар»). **Сальнікава А. С.** (яч. заводу «Дрэваапрацоўшчык»), **Засімчыка С. Д.** (зав. «Энэргія»), **Гольдбэрга С.** (яч. ВСНГ), **Шпака С. І.** (яч. дэко МВБ), **Грышэля О. Л.; Хвэйско** (ДПУ) і **Вілько К. С.** (яч. НКЮ).

Таксама просьба зьявіцца сакратаром тых ячэек, таварышы якіх выклікаюцца на пасяджэньне парттройкі.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 12 гадз. адбудзецца мастацкі раніпшік для парт. і камс. актыву. У праграме—сымфанічны канцэрт з удзелам салістага оперы М. Куклі-на. Білеты ў чытальні Дому штодня з 10 да 22 гадз.

У 19 гадз. у памяшканьні Кастрычніцкага райкому адбудзецца апошняе пасяджэньне праўленьня шэфтаварыства Кастрычн. раёну па пытаньні ліквідацыі праўленьня.

БДУ. У 18 гадз. у Актавай залі (стары будынак) адбуда. адкрыты партыйна-камсамольскі сход ячэйкі КП(б)Б Пэдфаку. Парадак дня: справаздача бюро ячэйкі і перавыбары. Яўка парт. і камс. абавяз. Запраш. беспарт. студэнцтва.

Мэдфак. Адкрыты сход яч. КП(б)Б Мэдфаку адбуда. у паталёга-анатамічнай аўдыторыі. Пачатак у 20 гадз. Парадак дня: справаздача бюро ячэйкі і перавыбары.

Клюб саўгандальслужачых. Кіно «У агні народжаная». Пач. 1-га сэансу ў 20 гадз., 2-га—у 22 гадз.

ЗАЎТРА

Клюб саўгандальслужачых. Мітынг-перакліч ка, прысьвечаны чысткі саўапарату. 18-га сакавіка ў клюбе саўгандальслужачых адбуда. вечар, прысьвечаны Парыскай Камуне.

Вячэрняя саўпартшкола. Наступныя заняткі вячэрняй саўпартшколы абудуцца 18-га сакавіка.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

3.500 ПАДПІСЧЫКАЎ НА „ЗЬВЯЗДУ" ПА АРШАНСКАЙ акрузе на КРАСАВІК м-ц 1930 год.

На сакавік месяц падпіска па акрузе складае 2.850 экз.

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ і ЎПОЎНАВАЖАНЫЯ!

ЗАРАЗ-ЖА РАЗГАРНЕЦЕ РАБОТУ па вярбоўцы новых кадраў ПАДПІСЧЫКАЎ

Канкрэтнымі, сапраўднымі мерапрыемствамі па пашырэньні „ЗЬВЯЗДЫ" ВЫКАНАЕМ гэту лічбу.

НІ АДНАГО партыйца і беспартыйнага антывістага БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ"

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68)

17 сакавіка ВЕЧАР—спатканьне камсамольцаў з пісьменьнікамі, прысьвечанае трохмесячніку беларускага культуры.

У спатканьні прымаюць удзел ячэйкі ЛСМ заводу «Бальшавік», Дзяржбанку, Камунбанку і іншыя.

— ПРАГРАМА: —

1. Даклад—Шляхі беларускай пралетарскай культуры і літаратуры.
2. Дыспут аб творы Лынькова М. «Гой».
3. Чытка новых твораў пісьменьнікамі.
4. Музычная частка.

Уваход па запрашальных білетах.)—(Пачатак а 7 гадзіне

ПРАЎЛЕНЬНЕ ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА

У СЕРАДУ 19 САКАВІКА — Клюб ДРУКАРОЎ — ЯШЧЭ 1 РАЗ

ВЫКЛЮЧНА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ — з удзелам — СЛАВУТАГА КІНО-АРТЫСТАГА

— ДУГЛАСА ФЭРБЭНКСА — у ФІЛЬМЕ

Тры мушкацеры

—) у 12 частках (—

2 СЭРЫІ—У АДЗІН СЭАНС

Цэны мясцом—20 кап.)—(Пачатак 1-га сэансу—7 г. увеч. » 2-га » 9 г. »

Білеты ў касе клюбу з 5 гадзін.

20-га сакавіка, а 10-й гадзіне раніцы, у памяшканьні рабочага клюбу г. Лепеля, Полацкай акругі, склікаецца рэдакцыямі газ. «Зьвязда» і «Чырвоная Полаччына» сумесна з Лепельскім райкомам КП(б)Б

раённая нарада рабселькораў Лепельскага раёну.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Газетывізацыя раёну і задачы селькораў.
2. Аб арганізацыі пасьцен газэт пры калгасах.

На нараду павінны зьявіцца члены рэдкалегій насьценгазэт, селькоры, рабкоры і сьпенкоры. Запрашаюцца калгасьнікі.

АБВЕСТКА.

У сувязі з закончэньнем перарэгістрацыі

на картачную систему заявак на жылую плошчу ўсе індывідуальныя заўўленьні і перапіскі аб прадстаўленьні памяшканьняў, падазеныя і ўвынікшыя да 15-га лютага 1930 году,

АНУЛЮЮЦЦА.

У далейшым на вучот жылстала будуць прымацца выключна толькі тыя катэгорыі працоўных, якія прадугледжаны пастановай прэзыдыўма Менгарсавету ад 19 студзеня г. г., а імянна:

1) Выдучэнцы, прыяжджаючыя ў Менск для працы ў цэнтральных і акруговых установах.

УВАГА. Выдучэнцы, да гэтага часу не перарэгістраваўшыяся, павінны абавязкова перарэгістравацца, без чаго задавальненьне іх памяшканьнямі немагчыма

2) Асобы, працуючыя на вайму, якія падлягаюць высяленьню з інтэрнатаў (вачлежныя дамы, дом дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, дом жанчын адзіночак, агульнажыцьцё беспрацоўных, школьныя інтэрнаты і г. д.)

3) Асобы, памяшканьні якіх зруйнаваны ад стыхійных выпадкаў (пажар, абвал дому, паводка).

4) Асобы, падлягаючыя высяленьню з памяшканьняў, знаходзячыяся на тэрыторыі прадпрыемстваў дзяржаўнай прамысловасьці.

5) Студэнты ступэндыяты, прыяжджаючыя у Менск у ВНУ, вытрымаўшыя месц у інтэрнатах.

6) Дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, застаючыяся у горадзе на ўражлівых прычынах.

Асобы, падлягаючыя ўзяцьцю на вучот жылстала, пісьмовых заяў не падаюць, а асабіста прадчыняюць у жылстол дакументы, неабходныя для запаўненьня рэгістрацыйных картак.

Асабістае наведваньне жылстала для атрыманьня даведак не патрэбна дзеля таго, што зарэгістраваныя асобы вынікаюцца позвамі праз пошту і праз агітатуру камгасу.

Загад. жылсталом прымае наведвальнікаў па пнядзелках і чацьвергах, ад 9 гадзіны раніцы да 1 гадзіны дня і па сярэдах і суботах ад 1 да 5 гадз. дня.

Адрас жылстала—Камсамольская вул. д. № 6, тэл. № 14-39.

Менкамгас.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА — Ем. ЯРАСЛАЎСКІ — КАРОТКІЯ НАРЫСЫ ПА ГІСТОРЫІ УсеКП(б), — ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ

Стар. 492. ЧАСТКА ДРУГАЯ. Ад пэрыяду імпэрыялістычнай вайны да нашых дзён. Цана 2 руб.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — ТОЛЬКІ 2 ДНІ — ВАРОТЫ КАЎКАЗУ — Падарожныя нэтаткі ў 6 част. — ГАРОЛЬД ЛЕЙД — У НОВАЙ КАМЕДЫІ у 3 частках. — звыш праграмы гастролі ТЭРМЭН-ВОКС

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Замежны мастацкі фільм — ЧАЛАВЕК АГНЮ — Пачатак 1 сэансу а 7 гадзіне. Каса—ад 5 гадзін.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі фільм вытворч. «Арменкіно» — ДЗЯЗОЛЬНІЦА драма ў 6 част. — Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — МАСТАЦКІ ХРАНІКАЛЬНЫ ФІЛЬМ — УПАД ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ у 7 частках — ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ — Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена а 12 гадз.

КІНО СПАРТАК — З пянядзелка, 10 сакавіка БЛЯВІКІ — КНЯЖНА МЭРЫ — паводле раману Лермантава. Драма ў 8 частках. — СЁНЬНЯ 4 СЭАНСЫ: — ПАЧАТАК 1-га сэансу—а 6 гадз. 2-га „ —а 7 г. 30 м. 3-га „ —а 9 г. 15 м. 4-га „ —а 10 г. 45 м. — КАСА—ад 5 гадз.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР — Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Субота, 22-га сакавіка — АДКРЫЦЬЦЁ СЭЗОНУ БДТ—2 У МЕНСКУ — Б. ЛАЎРЭНЕЎ — РАЗЛОМ — п'еса ў 4-х дзеях.

Пастаноўка Сяргея Радзімава. Музыка Паласінкіна. Мастак Ю. Гольц. Дырыжэр Ільля Гіттэрц. Хормайстэр М. Кауфман.

Уваход па запрашальных білетах. Рэшта білетаў на 2-III правадзіцца толькі ў рабочай касе. Пачатак роўна а 7 гадз.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР

Надзея, 16-га сакавіка

Вечар, прысьвечаны трохмесячніку беларускай і нацмэкаўскай культуры.

—РАЗЬВІТАЛЬНЫ ВЕЧАР—

БДЯТ—фабрыцы «Кастрычнік».

У праграме—адрыўкі з п'ес: „На пляцоўцы пануты", „Ботвінк", „Скапэн", „Авечая крыніца", „Сьвята ў Расрылаўцы" і „Дзікім Купэрко".

Пачатак роўна а 7 гадз. Білеты ў фабноме «Кастрычніка»

УВАГА: Грошы за білеты, узятыя на 18 і 19 сакавіка, з прычыны таго, што спэктаклі не адбудуцца, зварацаюцца ў касе тэатру штодзённа з 12—2 і з 5—9 г. увечары.

УВАГА: з пянядзелка, 17-га сакавіка

Пачатак кіно-сэансаў у кіно-тэатры „Культура"

ШТОДЗЕННА з 1 гадз. дня:

ПАМЯТАЙЦЕ!

На карціну „ХИЖИНА ДЯДИ ТОМА"

РАСКЛАД СЭАНСАЎ:

ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ: 1-ы а 1 г. дня, 2-гі а 3 г. 15 м. КАСА—ад 12 гадз. дня.

Удзень цэны на ўсе білеты ад 10 кап. да 35 кап.

ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ: 1-ы—а 7 г. увечары, 2-гі—а 8 г. 45 м., 3-ці—а 10 г. 30 м. КАСА—ад 5 гадз. увеч.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

З ПАНЯДЗЕЛКА, 17 САКАВІКА

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ

— МАСТАЦКІ ФІЛЬМ — Рэжысэр Е. ПЯТРОЎ

ПЕДЗЯНЫ ПЁС

— Драма ў 6 частках —

— У галоўных ролях: —

Бужынская, Ф. Хахлоў, Н. Празароўскі і В. Вікулін

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"

З панядзелка, 17 сакавіка

ШТОДЗЕННА 3 СЭАНСЫ

Гістарычная кіно-аповесьць

СЫН РЫБАКА

(М. В. Ламаносаў))—(у 7 частках

— У гал. ролях: —

заслужан. артысты К. Якаўлоў, Н. Сімонаў, П. Худалеў, І. Валодзька

Запамятайце пачатак сэансаў

— УВЕЧАРЫ: —

Пачатак 1-га сэансу роўна а 6 гадз. 30 м.
» 2-га » » » 7 » 50 м.
» 3-га » » » 9 » 10 м.
» 4-га » » » 10 » 30 м.

Каса адкрыта—ад 5 гадз.

— УДЗЕНЬ: —

Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз.
» 2-га » » 2 г. 30 м.
» 3-га » » 4 г.

Каса адкрыта—ад 11 г. 30 м.

Кіраўніцтва трэсту „ЛЕСБЕЛ"

гэтым паведамляе сваю кліентуру, што

з 15 сакавіка г. г. рэалізацыя ўсёй прадукцыі

як на Беларускім рынку, так і на ўсіх іншых рынках Саюзу

перадана поўнасьцю САЮЗЛЕСУ (быўш. Лесасындыкату)

У сувязі з гэтым камэрцыйны аддзел Лесбелу рэарганізуецца і ўсе дагаворы і ўмовы, што дзейнічаюць, перададзены для выкананьня УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ САЮЗЛЕСУ (Менск, готэль «ЭЎРОПА», № 26, тэлефон № 14-23).

Па ўсіх пытаньнях і спраўках камэрцыйнага характару (купля, продаж, адгрузка розных матэрыялаў, выкананьне прадаў) належыць у далейшым зьвяртацца

выключна ва Ўсебеларускую Кантору Саюзлесу,

куды таксама механічна, без усякага прагляду і паведамленьня аб гэтым адрасатаў будзе надалей перадавацца паступаючая ў лесбел карэспандэнцыя па ўсіх вышэйпаказаных пытаньнях.

ЛЕСБЕЛ

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

ЛЕН-МОСКВА

МОСКВА 55. 2-й ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. 8

УВАГА! Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ", пачынаючы з 17 сакавіка 1930 году, ПЕРАХОДЗІЦЬ НА БЕСЬПЕРАПЫННУЮ РАБОТУ з 12 гадз. дня.

На дзённыя сэансы ўсе месцы па 25 кап.

Пачатак дзённых сэансаў: 1-га—а 1 гадз., 2-га—а 2 г. 30 м., 3-га—а 4 г.

Каса адкрыта штодзённа з 12 гадз. дня

УВАГА!

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 7-81

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумэнта

ДА УВАГІ ДЗЯР КУСТАЎОЎ, ФОТА-АМАТАРАЎ, ПРАЦКАЛЕКТЫВАЎ, АРЦЕЛЯЙ І САМАТУЖНІКАЎ.

ЦЭНЫ ЗНІЖАНЫ

ФОТО-КІНО

МАГАЗЫН БЕЛДЗЯРЖКІНО

Ленінская, 7.

З 10 сакавіка ЦЭНЫ на фота-паперу, пласьцінкі, адкрыткі, кіно-ўстаноўкі і кіно-часткі ЗНІЖАНЫ ад 5 да 10%

Магазын КУПЛЯЕ і ПРАДАЕ карыстаныя фота-апараты і фота-прылады.

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

ЦЭНЫ ЗНІЖАНЫ

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галадзьдзеў № 337.